WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

10 ЛЮТАГА 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 26
(26890)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

БЕЗ НЕЎРЫТАЎ, НЕЎРАЛГІЙ І РАДЫКУЛІТАЎ

Тэмай нашай чарговай «прамой лініі» стануць пытанні лячэння і прафілактыкі хвароб неўралагічнага профілю: радыкулітаў, неўрытаў, неўралгій, сасудзістых захворванняў галаўнога мозга і г.д. Чытачам будзе адказваць **загадчык неўралагічнага аддзялення мінскай 10-й гарадской клінічнай бальніцы, кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр Віктаравіч ІВАНОЎ**.

«Прамая лінія» адбудзецца **17 лютага, у чацвер з 17.00 да 18.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21**. **Папярэднія пытанні можна задаваць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.**

ЧАС: СТАЯЦЬ І НЕ РУХАЦЦА?

або Ці будзем пераводзіць стрэлкі гадзіннікаў увосень?

Як ужо мы коратка паведамлялі, прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Мядзведзеў заявіў, што прыняў рашэнне з восені 2011 года адмяніць пераход на зімовы час, у сувязі з чым даў адпаведнае даручэнне ўраду Расіі. Мядзведзеў падкрэсліў, што неабходнасць адаптавання да пераводу стрэлак гадзіннікаў звязана з захворваннямі і стрэсам.

Пра апошнія фактары са спасылкай на медыкаў прыгадваюць кожны раз, калі ўвесну і ўвосень адбываецца пераход на летні ці зімовы час. Іх даследаванні паказваюць, што пераход неспрыяльна ўплывае на самаадчуванне людзей. Гэта парушэнне сну, і абменных працэсаў, і дзейнасці сардэчна-сасудзістай, а таксама імуннай сістэм. Энергетыкі ж у такіх спрэчках заўсёды парыруюць запэўніваннямі, што перавод стрэлак дазваляе больш рацыянальна выкарыстоўваць светлы час сутак і, адпаведна, эканоміць энергарэсурсы. Гучыць ад іх і аргумент, што пераход на зімовы і летні час, які быў уведзены ў Англіі яшчэ ў пачатку XX стагоддзя, зараз практыкуюць больш чым у ста краінах свету. Дык што будзе ў нас? Зараз адназначна можна сказаць толькі адно: прынамсі вясной гэтага года Беларусь, як і дагэтуль, пяройдзе на летні час, калі мы перавядзём стрэлкі гадзіннікаў на гадзіну наперад.

— Пераход на летні час і назад ажыццяўляецца ў нашай краіне ў адпаведнасці з пастановай урада. Калі больш канкрэтна, з 1996 года згодна з пастановай «Аб змяненні парадку вылічэння часу на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», — паведаміла «Звяздзе» кіраўнік прэс-службы Дзяржстандарта Тамара БУРДУКЕВІЧ. — Рашэнне аб адмене пераходу Расіі на зімовы час з восені гэтага года прынята да ведама, яно разглядаецца. На працягу лютага адбудзецца пасяджэнне Міжгаліновай камісіі часу, частаты і вызначэння параметраў вярчэння Зямлі, куды ўваходзяць прадстаўнікі больш чым дзесяці розных органаў дзяржаўнага кіравання, сярод якіх, напрыклад, спецыялісты міністэрстваў аховы здароўя, энергетыкі, прамысловасці, эканомікі, абароны і іншыя. Гэта камісія існуе ў краіне з канца 1990-х гадоў. Яна ўлічыць меркаванні ўсіх зацікаўленых бакоў і прыме адпаведнае рашэнне. Дата пасяджэння камісіі будзе вызначана ў бліжэйшыя дні.

Калі зараз розніца паміж Мінскам і Масквой складае адну гадзіну, дык у перспектыве яна можа павялічыцца да дзвюх гадзін.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ну і ну!

«ЖЫГУЛІ» ЎПАДАБАЛІСЯ ЗЛАЧЫНЦАМ

Прынамсі, у сталіцы летась менавіта гэта марка аўтамабіляў карысталася найбольшым «попытам» у злодзеяў. Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС, у мінулым годзе ў Мінску было зафіксавана 327 крадзяжоў аўтатранспарту, з якіх 90 злачынстваў — крадзяжы машын ВАЗ. «Апетыты» на іншыя аўтамабілі ў зламыснікаў больш сціплыя: напрыклад, летась зафіксавана 35 крадзяжоў аўтамабіляў «Фальксваген» і 20 — «Мерседэс-Бенц».

Акрамя таго, паведамляюць у ГУУС, у 2010 годзе ў Мінску было зафіксавана 2,7 тысячы кватэрных крадзяжоў, колькасць якіх з папярэднім годам зменшылася на 3 працэнты. Найбольш крадуць у «спальных» раёнах сталіцы і новабудоўлях горада, і ў першую чаргу гэта Фрунзенскі, Маскоўскі і Заводскі раёны. Дзве трэці крадзяжоў учынены з 8 гадзін раніцы да чатырох дня. Аналіз гэтых злачынстваў паказаў, што больш як 72 працэнты іх здзейснены шляхам свабоднага доступу. Гэта так званыя «гасцявыя» крадзяжы, крадзяжы пасля сумеснага застолля, праз незачыненыя дзверы, пад выглядам сацыяльных работнікаў. Між іншым, праваахоўнікі адшукалі і затрымалі зламыснікаў, якія мелі дачыненне больш як да паловы кватэрных крадзяжоў. У прыватнасці, спынена дзейнасць 14 арганізаваных злачынных груп, у склад якіх уваходзілі 32 чалавекі, і даказана іх дачыненне да ўчынення 317 кватэрных крадзяжоў. Акрамя таго, затрыманы 16 злодзеяў-адзіночак.

РАБАЎНІЦА АДАБРАЛА $9 800

Пацярпелая, 45-гадовая мінчанка, не змагла абараніцца ад 37-гадовай нахабніцы.

Зламысніца выйшла пераможцам з «разборак», якія ўчыніла ў кватэры сваёй ахвяры, якая пражывае на вуліцы Сердзіча. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, падазроная раней ужо прыцягвалася да крымінальнай адказнасці — была асуджана за рабаўніцтва. Аналагічнае злачынства яна ўчыніла і на гэты раз, сілком адабраўшы ў жанчыны вялікія грошы — 9800 долараў ЗША. У дачыненні да прадстаўніцы слабай паловы (якая насамрэч «адарвалася» ад падобных стэрэатыпаў, — аказалася далёка не такой ужо слабай і бяскрыўднай) заведзена крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

«КАЛІ РАДОК З ДУШОЮ АДЛІТЫ, ДЫК ЁН ЖЫВЕ...»

У БЕЛАРУСІ РАСПАЧАЛАСЯ XVIII МІНСКАЯ МІЖНАРОДНАЯ КНІЖНАЯ ВЫСТАЎКА-КІРМАШ

Сапраўдны кніжны рай для аматараў літаратуры адкрыўся ўчора ў НВК «БелЭКСПА». На адкрыцці XVIII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу яблыку не было дзе ўпасці — паўсюль літаратары, навукоўцы, журналісты, кнігавыдаўцы, прадстаўнікі пасольстваў і конкульстваў...

— Сёлета ў нас амаль самая вялікая лічба экспанентаў — 605, у Мінску прадстаўлена кніжная прадукцыя з 23 краін свету, — расказаў на адкрыцці кніжнага форуму **міністр інфармацыі Беларусі Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ**. — І наша выстаўка адкрывае спецыяльную акцыю «У падтрымку чытання» — сумесны праект Міністэрства інфармацыі разам з Міністэрствамі адукацыі і Міністэрствам культуры. Усе мерапрыемствы, якія пройдуць у бліжэйшыя дні на выстаўцы, будуць накіраваны ў першую чаргу на папулярызацыю кнігі. Тут можна будзе азнаёміцца не толькі з кнігай у яе традыцыйным разуменні, але і прасачыць, якія электронныя навінкі з'явіліся ў гэтай галіне. Вельмі прыемна, што нашым ганаровым госцем сёлета стала Германія — радзіма славутага кнігадрукара Іагана Гутэнберга.

— Заўсёды вельмі карысна адно ў аднаго павучыцца. Ганаровыя госці на выстаўцы — цудоўная магчымасць ім жа самім прадэманстраваць СВАЁ бачанне ў развіцці кніжнай вытворчасці, культуры кнігі, яе тэматыкі і афармлення, — упэўнены **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр РАДЗЬКОЎ**.

СТАР. 2

НАСТАССЯ ЗАБЛОЦКАЯ ВЫЙШЛА Ў ФІНАЛ ЧЭМПІЯНАТУ ЕЎРОПЫ

Гродзенская тэнісістка Настасся Заблоцкая заняла першае месца на адборачным турніры юніёрскага каманднага чэмпіянату Еўропы, які прайшоў у Галандыі. Выступаючы пад № «1» у зборнай Беларусі, яна атрымала перамогу над мацнейшымі юнымі тэнісісткамі Польшчы, Вялікабрытаніі, Іспаніі і заваявала пуцёўку ў фінал еўрапейскага чэмпіянату, які адбудзецца ў Чэхіі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Стыхія

ПАЦЯРПЕЛЫХ АД УРАГАНУ «НІКАЛАС» У БЕЛАРУСІ НЯМА

Моцны вецер за мінулыя суткі абясточыў больш як 1,3 тыс. населеных пунктаў

Фота БЕЛТА.

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Паводле аператыўных даных, з-за парываў ветру (да 25 м/с) 8-9 лютага пацярпелі восем населеных пунктаў у Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях. Пашкоджаны дахі чатырох жылых дамоў, аднаго аб'екта сацкультбыту, аднаго вытворчага і двух сельскагаспадарчых будынкаў.

Паводле даных ДВА «Белэнерга» на тэрыторыі рэспублікі было абясточана 1318 населеных пунктаў (у 257 электразабеспячэнне на ўчарашні дзень яшчэ не было адноўлена).

У Мінску па вул. Казінца ў выніку раставання снегу, моцных ападкаў і ўздзеяння ветру пашкоджаны чатыры апоры атракцыёна (рэйкавыя санкі), адбыўся сход земляной масы са схілу гарналыжнага цэнтра «Сонечная даліна».

Фота БЕЛТА.

Ураган «Нікалас» са скорасцю кур'ерскага поезда — больш як 100 км/гадз — пранёсся праз Балтыйскае мора і Фінскі заліў, учора яго цэнтр размяшчаўся над Маскоўскай вобласцю, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава.

Дарэчы, паводле даных шматгадовых назіранняў, скорасць ветру 25 метраў за секунду ў тым ці іншым населеным пункце Беларусі адзначаецца адзін раз у пяць гадоў.

ДРЭВЫ ПАДАЛІ НА ЛІНІІ ЭЛЕКТРАПЕРАДАЧ І АЎТАМАБІЛІ

8 лютага моцным шквалістым ветрам на тэрыторыі Гродзеншчыны парушылася электразабеспячэнне ў 252-х населеных пунктах, паведамляе прэс-служба абласнога ўпраўлення МНС. У рэгіёне зафіксавана 28 выпадкаў падзення дрэў на лініі электрапередач.

Абясточана 8 фермаў, 304 трансфарматарныя падстанцыі, пашкоджана 41 лінія электрапередач. Па стане на ўчарашнюю раніцу трэба было аднавіць электразабеспячэнне ў 106 населеных пунктах, у тым ліку на трох фермах, дзе працавалі электрагенератары. Паводле папярэдніх звестак, пашкоджана 16 пабудоў, з дахаў сарвана каля 3 тысяч лістоў шыферу.

Дрэвы, якія трапілі пад удар стыхіі, падалі не толькі на лініі электрападач, але і ў чатырох выпадках перакрылі дарогі, а таксама пашкодзілі чатыры легкавыя машыны ў абласным цэнтры. Людзі, дзякуй богу, траўмаў не атрымалі.

Акрамя таго, у некаторых месцах парывістым ветрам пашкоджаны дарожныя знакі і святлафорныя аб'екты. У такіх умовах Дзяржаўтаінспекцыя заклікае вадзіцеляў быць асцярожнымі падчас руху на адкрытых участках дарог, каб своечасова спыніцца ў выпадку з'яўлення абломкаў дрэў. Таксама не варта паркаваць аўтамабілі паблізу дрэў, асабліва старых.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

10,5 ТЫСЯЧЫ КУРАНЯТ

выратавалі ад вернай гібелі спецыялісты МНС. Жыццё сямідзённых птушак, якія належаць сельскагаспадарчаму філіялу «Дудзічы» ААТ «Калінкавічыхлебапрадукт», размешчанаму ў вёсцы Буда Калінкавіцкага раёна, аказалася пад пагрозай пасля таго, як ураган «Нікалас» пакінуў без энерга- і цеплазабеспячэння птушнік.

Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, моцны вецер знёс дах санітарна-прапускнога пункта прадпрыемства. Шыфер, які ноччу злятаў з пабудовы, пашкодзіў лініі электрапередач. Птушаняты засталіся без святла і цяпла. Выратавальнікі сумесна з мясцовымі энергетыкамі аператыўна падключылі да электрычнай сеткі будынка перасоўны генератар і такім чынам аднавілі энерга- і цеплазабеспячэнне аб'екта. Кураняты не пацярпелі. Зараз у гаспадарцы вядуцца аднаўленчыя работы. На Гомельшчыне, дзе пацярпела 15 раёнаў, удакладняюцца маштабы пашкоджанняў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Андрэй ХАРКАВЕЦ:

«У РАМКАХ НОВАЙ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ НІЯКІЯ НОВЫЯ ПАДАТКІ ЎВОДЗІЦЦА НЕ БУДУЦЬ»

«У гэтым няма неабходнасці, — зазначыў міністр фінансаў Андрэй Харкавец падчас пашыранага пасяджэння калегіі Мінфіна. — Разам з тым, у краіне будзе працягнутая праца, накіраваная на паляпшэнне якасных характарыстык падатковай сістэмы краіны, завяршэнне адаптацыі бухгалтарскага ўліку да міжнародных стандартаў фінансавай справаздачнасці, на развіццё фінансавага рынку і аптымізацыю формаў і аб'ёмаў дзяржаўнай падтрымкі эканомікі».

Міністр нагадаў, што за мінулыя гады ў рэспубліцы для паляпшэння падатковай сістэмы зроблена шмат. У прыватнасці, былі адменены 26 падатковых плацяжоў, зніжаны стаўкі па 4 падатках і зборах, устаноўлены штоквартальныя тэрміны платы асноўных падаткаў, уведзена адзіная стаўка падаходнага падатку з фізічных асоб, спрошчана збіранне падаткаў на прыбытак, на дабаўленую вартасць, нерухомасць і экалагічнага падатку, завершана кадыфікацыя падатковага заканадаўства і ўведзены ў дзеянне Падатковы кодэкс. «Тым самым, — падкрэсліў Андрэй Харкавец, — сёння поўнасцю вырашана пытанне са структурай падаткаў і колькасцю падатковых плацяжоў, якія адпавядаюць стандартам развітых краін». Паводле яго слоў, аснову нашай падатковай сістэмы складаюць сем падаткаў, якія дазваляюць фінансаваць дзяржаўныя расходы на неабходным узроўні, не ствараючы пры гэтым абмежаванняў для эканамічнага росту.

Падводзячы вынікі выканання бюджэту за мінулую пяцігодку, Андрэй Харкавец праінфармаваў прысутных, што за гэты перыяд даходы бюджэту ўзраслі на 28,4 працэнта, расходы — на 37, зарплата ў бюджэтным сектары ў снежні мінулага года ў параўнанні са снежнем 2005-га павялічылася з 249 долараў ЗША да 473 у эквіваленце. Што датычыцца леташніх вынікаў, то за 2010 год у кансалідаваны бюджэт паступіла 48,8 трыльёна рублёў даходаў, ці 101 працэнт удакладненага плана. План даходаў быў выкананы ва ўсіх абласцях і Мінску. У параўнанні з пазамінулым годам летась паступленні павялічыліся на 2,2 трыльёна рублёў, ці на 4,6 працэнта. Расходы кансалідаванага бюджэту за мінулы год склалі 53 трыльёны рублёў, ці 98,1 працэнта гадавога плана. Яго дэфіцыт за 2010 год склаў 4,2 трыльёна рублёў, ці 2,6 працэнта да ВУП. «Мабыць, за мінулае пяцігоддзе мы маглі дасягнуць і большага, калі б з 2008 года эканоміка краіны не была ўцягнута ў сусветны фінансавы крызіс», — заўважыў міністр. Аднак, паводле яго слоў, рэспубліцы ўдалося пазбегнуць глыбокай рэцэсіі, характэрнай для многіх эканомік свету, стабілізаваць макраэканамічную сітуацыю.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МВФ ПАТРАБУЕ АД УКРАІНЫ ПАВЯЛІЧЫЦЬ КОШТ НА ГАЗ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

Перамовы Украіны з Міжнародным валютным фондам пра вылучэнне чарговага транша крэдыту праходзяць няпроста з-за патрабавання МВФ павялічыць тарыфы на газ і энерганосьбіты для насельніцтва, заявіў украінскі прэм'ер-міністр Мікалай Азараў.

«МВФ цвёрда настойвае на жорсткіх падыходах да бюджэтнай палітыкі. З іншага боку, у нас ёсць сваё бачанне — напрыклад, прывядзенне тарыфаў на цяпло і энерганосьбіты да ўзроўню рынкавых», — цытуюць агенцтвы выступленне Азарава. Паводле слоў кіраўніка ўрада Украіны, сёлета няма неабходнасці рэзкага павышэння тарыфаў. «У той жа час фінансавыя рэсурсы МВФ ва ўмовах нявызначанасці знешніх рынкаў — гэта вельмі важны фактар стабільнасці фінансавай сітуацыі ва Украіне. Усе члены ўрада, якія бяруць удзел у перамовах з МВФ, павінны зыходзіць з балансу інтарэсаў абодвух бакоў», — адзначыў Мікалай Азараў.

ІРЛАНДЫЯ АДМОВІЛАСЯ ВЫДАВАЦЬ КІРГІЗСКАГА ЭКС-МІНІСТРА

Ірландыя адмовілася экстрадзіраваць экс-міністра энергетыкі Кіргізіі Сапарбека Балкібекава, якога на радзіме абвінавачваюць у злоўжыванні паўнамоцтвамі. Пра гэта паведамляе IA «24.kg». Паводле інфармацыі агенцтва, Генпракуратура Кіргізіі атрымала надоечы адпаведнае апавяшчэнне.

Спасылаючыся на пракуратуру, агенцтва паведамляе, што Балкібекаў атрымаў у Ірландыі палітычнае сховішча.

САРКАЗІ ЗАПАТРАБАВАЎ АД МІНІСТРАЎ АДПАЧЫВАЦЬ У ФРАНЦЫІ

Прэзідэнт Францыі Мікаля Сарказі запатрабаваў ад членаў кабінета міністраў праводзіць адпачынкі ў Францыі.

Нагодай для гэтага паслужыў скандал, які разгортваецца вакол прэм'ер-міністра Францыі Фіёна і міністра абароны Мішэль Аліа-Мары. Журналісты высветлілі, што адпачынак абодвух чыноўнікаў у Егіпце і Тунісе збольшага аплачвалі мясцовыя рэжымы.

Так, высветлілася, што прэм'ер з сям'ёй лятаў па Егіпце на самалёце, «пазычаным» прэзідэнтам Егіпта Хосні Мубаракам, а кіраўнік МЗС лятала на самалёце, прадстаўленым туніскім бізнэсменам, блізкім да звергнутага дыктатара Бэн Алі.

«З гэтага часу раю міністрам адпачываць у Францыі, — заявіў з гэтай нагоды Сарказі. — Прапановы падобнага роду ад замежнікаў павінны ў будучым атрымліваць адабрэнне ў прэм'ер-міністра і прэзідэнцкай адміністрацыі».

УРАД ПАКІСТАНА СЫШОЎ У АДСТАЎКУ ДЗЕЛЯ ЭКАНОМІІ

Як адзначае Agence France-Presse, урад Пакістана будзе афіцыйна расфарміраваны, калі прэзідэнт Асіф Алі Зардары фармальна прыме прашэнні аб адстаўцы міністраў.

Міністры падалі прашэнні аб адстаўцы прэм'ер-міністру краіны падчас урадавага пасяджэння ў серады, 9 лютага. Зараз прэм'ер павінен сфарміраваць новы кабінет міністраў, які, як паведамлялася, будзе меншым па колькасці членаў за папярэдні. Гэта абумоўлена неабходнасцю скарачэння выдаткаў на ўрадавы апарат Пакістана.

WIKILEAKS: САУДАЎСКАЯ АРАВІЯ ЗАВЫШАЕ ЗВЕСТКІ ПРА ЗАПАСЫ НАФТЫ НА 40%

Запасы найбуйнейшай нафтаздабыўнай краіны свету — Саудаўскай Аравіі — могуць быць менш чым заяўленыя на 40%, вынікае з дыпламатычнай перапіскі, якая стала здабыткам грамадскасці з дапамогай WikiLeaks.

Амерыканскія дыпламаты, якія працавалі ў Эр-Рыядзе, у прыватных гутарках з саудаўскімі партнёрамі высветлілі, што рэальныя запасы нафты каралеўства могуць аказацца на 300 млрд барэляў ніжэйшыя, чым афіцыйныя. У сувязі з гэтым амерыканскія дыпламаты папярэджвалі Вашынгтон у 2007—2009 гадах пра тое, што Саудаўская Аравія можа не справіцца з задачай насычэння рынка нафтай і стрымліваннем кошту на нафту, піша брытанская Guardian.

Твае правы

РАСКЛАД ДЛЯ ПЕНСІЙНАЙ ПРЫБАЎКІ

Сяргей ГРЫБ

ШМАТЛІКІЯ сацыялагічныя даследаванні сведчаць, што другой па значнасці крыніцай даходаў беларусаў з'яўляюцца пенсіі, прычым для многіх грамадзян краіны яны — ужо даход адзіны. Таму кожнае чарговае павышэнне гэтых выплат з'яўляецца па-сапраўднаму доўгачаканым. Між тым, пры якіх умовах адбываецца індэксацыя пенсій і што рабіць у выпадку, калі ўзнікае права на тую або іншую дадатковую прыбаўку? Разабрацца з гэтымі пытаннямі мы паспрабуем з дапамогай начальніка аддзела прызначэння і выплат пенсій камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Алы Яраславаўны КОЛБІК.

БПМ або сярэдняя зарплата

Умовы павышэння пенсій розныя. Так, мінімальныя і сацыяльныя пенсіі, а таксама надбаўкі і павышэнні да іх знаходзяцца ў «прывязцы» да бюджэту пражыткавага мінімуму. БПМ пераглядаецца і, як правіла, павялічваецца, чатыры разы ў год — з 1 лютага, 1 мая, 1 жніўня і 1 лістапада. З гэтых жа дат звычайна індэксуюцца і ўзгаданыя віды пенсій.

А вось падстава для перараразліку працоўных пенсій іншая — рост сярэдняй зарплаты па краіне.

— Паводле 70 артыкула Закона «Аб пенсійным забеспячэнні» павышэнне працоўных пенсій робіцца тады, калі ў мінулым кварталe сярэдняя па краіне зарплата работнікаў адносна моманту папярэдняга перараразліку павялічылася на 15 працэнтаў, — распавядае Ала Колбік. — Пры гэтым той жа закон вызначае: калі неабходнага 15-працэнтнага росту заробкаў няма, то працоўныя пенсіі індэксуюцца адзін раз у год з 1 лістапада — зыходзячы з фактычнага павелічэння сярэдняй зарплаты за III квартал. Зрэшты, варта таксама заўважыць, што ў гэтым агульным правіле бываюць пэўныя выключэнні. У нас можа быць праведзены і пазачарговы перараразлік працоўных пенсій — на падставе ўказа кіраўніка дзяржавы.

Павышэнне ў кожнага сваё

Працэнт росту сярэдняй пенсіі падчас перараразліку супадае з працэнтам росту сярэдняй зарплаты. Аднак такі малюнак атрымліваецца ў цэлым, а на справе ў кожнага пенсіянера прыбаўка будзе «свая».

— Напрыклад, у адных пенсіі могуць узрасці на 5, а ў іншых — на 10 працэнтаў, — адзначае Ала Колбік. — І ніякага парадоксу тут няма, бо ў кожнага — свой індывідуальны каэфіцыент заробку і зноў жа свая працягласць працоўнага стажу. Таму чым большыя каэфіцыент і стаж — тым большай будзе прыбаўка.

Змяненне без «зваротнай сілы»

Як вядома, у асноўным, на ўзровень пенсій уплывае індывідуальны каэфіцыент заробку. Ён разлічваецца адносна — скажам, сёлета за 17 гадоў запар з 27 апошніх гадоў працы. Прычым да ўвагі прымаюцца ўсе заробкі, на якія налічваліся і з якіх утрымліваліся ўзносы дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. І ў тым ліку — заробкі не па асноўным месцы працы.

Між тым часта здараецца наступнае: пацвярджэнне «не асноўных» заробкаў знаходзіцца ўжо пасля прызначэння пенсіі. Што рабіць у такім выпадку?

— Перш-наперш трэба мець на ўвазе: не ўлічаныя пры вызначэнні індывідуальнага каэфіцыента заробкі пасля 1 студзеня 2003 года (моманту ўвядзення індывідуальнага персаніфікаванага ўліку страхавых адлічэнняў) павінны пацвярджацца выпіскай з асабістага рахунка з Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, а заробкі да 1 студзеня 2003 года — даведкамі былых работадаўцаў, — значае Ала Колбік. — І калі такія пацвярджэнні ёсць — чалавек мае поўнае права звярнуцца ва ўпраўленне сацыяльнай абароны па месцы атрымання пенсіі з заявай аб змяненні індывідуальнага каэфіцыента. Аднак варта памятаць: новы індывідуальны каэфіцыент «запрацуе» толькі з 1 чысла наступнага за падачай заявы месяца, і перараслікаў пенсіі за ўвесь папярэдні час не будзе. А адсюль і парада: каб не ўзнікала аніякіх праблем і шкадаванняў, звесткі аб ранейшых заробках лепш збіраць загадзя — яшчэ да афармлення пенсіі.

Пры атрыманні I групы варта палічыць

Асобная гаворка аб пенсійных надбаўках. Даволі распаўсюджаныя сярод іх — надбаўкі на догляд, якія прызначаюцца інвалідам I групы або асобам, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту. Па сутнасці, звяртацца ва ўпраўленне сацыяльнай абароны тут не трэба. Інфармацыя аб узросце і прызначэнні I групы інваліднасці знаходзіцца ў камп'ютарнай базе. Таму надбаўкі будуць прызначаны аўтаматычна — з 1 чысла наступнага месяца, у якім з'явіўся адпаведны статус.

— Аднак у такім выпадку хацелася б сказаць колькі слоў аб інвалідах I групы: не выключана, што пасля атрымання гэтай групы зварот ва ўпраўленне сацыяльнай абароны для іх усё ж мае сэнс для пераходу на больш высокую пенсію па інваліднасці, — заўважае Ала Колбік. — У прыватнасці, гэта датычыцца жанчын, якія маюць менш за 40, і мужчын, якія маюць менш за 45 гадоў стажу.

Як зняць «абмежаванне»?

Нарэшце, яшчэ адзін момант. Не сакрэт, што для пенсіянераў, якія працуюць, наша заканадаўства прадугледжвае пэўнае абмежаванне — маецца на ўвазе выплата пенсій, зыходзячы з індывідуальнага каэфіцыента не больш за 1,3. Таму калі індывідуальны каэфіцыент вышэйшы і пенсіянер вырашае пакінуць працу, то для зняцця абмежавання і выплаты пенсіі ў поўным аб'ёме необходна падысці з працоўнай кніжкай ва ўпраўленне сацыяльнай абароны.

— Але адначасова трэба падкрэсліць: калі пенсіянер з індывідуальным каэфіцыентам больш за 1,3 уладкоўваецца на новае месца, то работадаўца абавязаны на працягу 5 дзён паведаміць аб гэтым ва ўпраўленне сацыяльнай абароны, — падкрэслівае Ала Колбік. — Прычым паклапаціцца аб такім паведамленні павінен і сам пенсіянер, які працуе. Бо ў адваротным выпадку існуе верагоднасць сутыкнуцца з фактычнай пераплатай пенсіі. А пераплату прыйдзецца вяртаць.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.02.2011г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲1 долар ЗША	3 009,00	1 чэшская крона	169,80	USD	29,3010
▲1 еўра	4 108,19	1 польскі злоты	1 052,19	10 UAH	36,8358
1 латвійскі лат	5 852,38	▼1 расійскі рубель	102,69	1000 BYR	9,7378
1 літоўскі літ	1 188,76	1 украінская грыўня	378,18	EUR	39,9871

Агенства Урадавага Гранцавання

«КАЛІ РАДОК З ДУШОЮ АДЛІТЫ, ДЫК ЁН ЖЫВЕ...»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Мы павінны сачыць за ўсім, што сёння так імкліва развіваецца ва ўсім свеце — інтэрнэт, планшэты. Але ні ў якім разе не забывацца на кнігу. Кніга — гэта душа, магчымасць адчуць сябе і магчымасць узгадаць гісторыю. Раней казалі, што памрэ тэатр, бо нарадзілася кіно. Але тэатр не памёр. Тая ж сітуацыя і з кнігай. Чытанне стала традыцыяй. Людзям зручна карыстацца кнігамі — значыць, кнігі будуць жыць.

Германія стала шостай па ліку краінай пасля Расіі, Украіны, Ізраіля, Казахстана і Францыі, якая выступае на Мінскай МКВК у статусе ганаровага госця.

— Мы разглядаем гэтае запрашэнне як прызнанне нашага шматгадовага супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь, — прызнаецца **надзвычайны і паўнамоцны пасол Германіі ў Беларусі Крыстаф ВАЙЛЬ**. — Кніга — унікальны прадмет. Тут — возьмеш крупінку паэзіі, там — дроб філасофіі, дадасі порцыю гісторыі — і вось ты зноў малады, моцны духам і светлы душой. На нашай экспазіцыі можна азнаёміцца з найноўшымі нямецкімі выданнямі, якія пабачылі свет у 2010-м годзе.

Лепш адзін раз пабачыць

Нездарма яшчэ Пятрусь Броўка прыкмячаў: «Калі радок з душою адліты, дык ён жыве...». Жыццё на кніжнай ярмарцы — бурлівае, як рака. Сотні крыніц плывуць паралельна, зліваючыся ў адзін вялікі імклівы паток, галоўная ў якім — кніга. Тысячы і тысячы радкоў, мільёны слоў, процьма назваў... «Выдавецтва беларускага Экзархата» і каталіцкае выдавецтва «Про Хрысто», «Мастацкая літаратура» і «Беларуская навука», «Пачатковая школа» і «Вышэйшая школа» — кніжная прадукцыя на любы густ. Чырвоныя кнігі, сінія, зялёныя, з пазалочанымі старонкамі і без іх, у цвёрдай вокладцы і ў мяккай, з малюнкамі і з карыкатурамі, вялікія і малыя, беларускія і замежныя.

Як трапна зазначыў **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ**, «палітыка кнігі перамагае ўсе іншыя палітыкі», яна яднае.

На стэндзе Францыі — не менш ажыўлена, чым у сёлетніх ганаровых гасцей, немцаў. Прынамсі, найбольш тут прывабліваe знешні выгляд, афармленне стэнда — фіялетавая колеравая гама заспакойвае і дае магчымасць воку сканцэнтравацца на кніжных навінках.

— Як і летась, сёлета мы прапануем наведвальнікам кнігі на французскай, беларускай і рускай мовах, — гаворыць **саветнік па супрацоўніцтве і культуры пасольства Францыі ў Беларусі Людовік РУАЙЕ**. — Нецікава было б прэзентаваць французскія кнігі, якія ёсць у бібліятэках Беларусі.Таму мы пастараліся сабраць тыя кнігі, якія нідзе ў Беларусі знайсці нельга — усё, што выйшла ў Францыі з кастрычніка 2010 года, а таксама тыя кнігі, якія могуць зацікавіць беларускіх чытачоў. Ёсць кнігі адразу на дзвюх мовах: па-французску і ў беларускім перакладзе.

Германія, Францыя, Арменія, Куба, Літва, Венесуэла, Сербія, Швейцарыя, Італія... Кожная краіна падрыхтавала чытачам штось асаблівае. Аўтограф-сесіі з літаратарамі, сустрэчы з кнігавыдаўцамі, літаратурныя чытанні, конкурсы, віктарыны, латарэі.

Мінская міжнародная выстаўка-кірмаш будзе працаваць з 10 гадзін раніцы штодзень да 13 лютага ўключна. Збіраючыся на кірмаш, не забудзьцеся на вялікую сумку і кашалёк: на большасці стэндаў спецыяльна падрыхтавалі эксклюзіўныя кнігі, якія можна набыць у хатнюю бібліятэку.

Ілья ЛАПАТО.

«У РАМКАХ НОВАЙ ПРАГРАМЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ НІЯКІЯ НОВЫЯ ПАДАТКІ ЎВОДЗІЦЦА НЕ БУДУЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Разам з тым, каб падобныя рызыкі не аказвалі негатыўны ўплыў на айчынную эканоміку ў будучым, сярод важнейшых задач, якія ставяцца ў праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2011—2015 гады, — якасна новае развіццё краіны, рост дабрабыту і ўмоў жыцця насельніцтва на аснове інавацыйнага развіцця і павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі. Адсюль і мэты бюджэтна-падатковай палітыкі, пра якія ішла гаворка на калегіі: у прыватнасці, гэта фарміраванне спрыяльнага бізнэс-клімату для айчынных і замежных інвестараў, стварэнне эканамічных стымулаў для вытворчасці канкурэнтаздольнай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю. Як паведаміў міністр, ужо з наступнага года будзе прапанавана вывесці з падаткаабкладання інвестыцыі і інавацыі. Ад падатку на прыбытак будуць поўнасцю вызвалены сродкі, накіраваныя на стварэнне новых і мадэрнізацыю дзейных вытворчасцяў. «Калі ўтворанае прадпрыемства ці вытворчасць пачне прыносіць прыбытак, яна будзе вызваляцца ад падатку да поўнай акупляльнасці затрат, якія былі панесены. Гэта аснова для прыцягнення доўгатэрміновых інвестыцый», — зазначыў Андрэй Харкавец.

Па падатку на дабаўленую вартасць будуць зняты часовыя і колькасныя абмежаванні па падатковых выліках. Як толькі будуць зроблены інвестыцыйныя затраты, інвестару з бюджэту вернуць выплачаны пры гэтым падатак. У выніку ў прадпрыемстваў з'явяцца дадатковыя рэсурсы для інвестыцый і папаўнення абаротных сродкаў, кошт інвестыцыйных праектаў знізіцца, што дасць рэальны штуршок да актывізацыі інвестыцыйнай дзейнасці. Акрамя таго, міністр прапанаваў панізіць да 10 працэнтаў стаўку падатку на прыбытак ад рэалізацыі высокатэхналагічных тавараў уласнай вытворчасці. Ён лічыць, што ўсё гэта дазволіць адмовіцца ад прадстаўлення шматлікіх індывідуальных падатковых ільгот, пакалькі іх абгрунтаванасць часам вельмі сумнеўная, а іх прымяненне стварае дыспрапорцыі ва ўмовах канкурэнцыі. Гэта не значыць, што льгот не будзе зусім, але доступ да іх павінен быць роўным, упэўненыя ў Мінфіне.

«Калі мы вырашым пытанне з ільготамі, — зазначыў Андрэй Харкавец, — можна падумаць аб зніжэнні стаўкі падатку на прыбытак як асноўнай крыніцы інвестыцый». Папярэдне ў Мінфіне вядуць размову пра зніжэнне стаўкі з 2012 года на 2-4 працэнтныя пункты. У тым жа выпадку, калі эканоміка будзе паказваць добрыя вынікі, то ў наступным, лічаць у міністэрстве, стаўку можна знізіць і да 18 працэнтаў, «што зробіць Беларусь адной з краін з самым нізкім узроўнем падаткаабкладання прыбытку ў рэгіёне».

Асаблівы акцэнт міністр зрабіў на неабходнасці працаваць і жыць па сродках. У прыватнасці, міністэрства будзе настойваць на тым, каб пралангацыя і невярнанне бюджэтных сродкаў ці неплацяжы па іх аўтаматычна павышалі стаўку па крэдытах як мінімум да стаўкі рэфінансавання. Андрэй Харкавец згадаў, што мінулая пяцігодка пачыналася з таго, што дзяржава аказвала падтрымку ў выглядзе прамога субсідзіравання і бюджэтных пазык. Гэты від падтрымкі апошнім часам удалося звесці да мінімуму і перайсці да больш эфектыўнага яе віду — кампенсацыі частак працэнтаў па банкаўскіх крэдытах. Прычым сума такой падтрымкі ўвесь час расце: сёлета ў параўнанні з 2008 годам яна павялічылася больш як у 5 разоў да 2,2 трыльёна рублёў. І падтрымка дзяржавы маштабная, ёй пранізаныя практычна ўсе сферы эканомікі. «У выніку каля паловы ўсіх крэдытаў, якія выдаюцца рэальнаму сектару эканомікі, ільгатуюцца за кошт бюджэту, — паведаміў міністр. — Але больш за ўсё прыцягнутае тое, што, калі адзін раз даць магчымасць скарыстацца бюджэтнай падтрымкай, вярнуць рэсурсы становіцца крайне складана. У гэтай сітуацыі шырмай для нядобрасумленных кіраўнікоў становяцца цяжкасці рынку, страта збыту і іншыя прычыны». Ён дадаў, што, акрамя таго, рэсурсы, якія прадастаўляюцца на годдва, не адзін раз пралангіруюцца, і, атрымаўшы танныя абаротныя сродкі, ніхто не збіраецца ад іх адмаўляцца. На думку Андрэя Харкаўца, ад гэтай практыкі трэба адмаўляцца, ільготныя крэдыты, бюджэтныя пазыкі павінны мець строга мэтавую накіраванасць. «Асаблівую актуальнасць, — падкрэсліў ён, — гэта набывае ў сучасных умовах, калі Беларусь актыўна пазычае рэсурсы на знешніх рынках».

Таксама на калегіі Андрэй Харкавец заявіў пра неабходнасць скарачэння колькасці работнікаў бюджэтнай сферы на 10-15 працэнтаў. Паводле яго меркавання, бюджэтны сектар не павінен быць статычным, ён павінен рэфармавацца разам са змяненнем эканамічнай сітуацыі. «Зараз асноўная задача — перагляд сеткі і штатаў бюджэтных арганізацый, і перадумовы для гэтага існуюць», — лічыць міністр. Доля эканамічна актыўнага насельніцтва, якое занята ў бюджэтным сектары рэспублікі, паводле агучаных звестак, істотна перавышае паказчыкі суседніх краін з падобным узроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця. Міністр паведаміў, што ў выпадку скарачэння колькасці занятых у бюджэтнай сферы на 10-15 працэнтаў эканомія бюджэтных сродкаў складзе каля 2 трыльёнаў рублёў у год, большую частку з якіх можна было б перараз меркаваць на фінансаванне інвестыцый у развіццё бюджэтнай сферы і вывесці яе на якасна новы ўзровень. Аптымізацыя колькасці занятых у бюджэтнай сферы і сеткі бюджэтных арганізацый, зазначыў Андрэй Харкавец, — гэта сумесная ўзважаная прафесійная праца галіновых міністэрстваў, рэгіянальных улад і фінансавых органаў. Пры гэтым задачай Мінфіна з'яўляецца, зыходзячы з прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, устанавіць ліміты фінансавых сродкаў для галіновых міністэрстваў і рэгіёнаў з улікам эканамічных магчымасцяў дзяржавы. Міністр канстатаваў, што «не аб'ёмы фінансавання павінны адпавядаць сетцы бюджэтных устаноў, а, наадварот, штаты, сетка бюджэтных арганізацый, расходы на мадэрнізацыю і развіццё павінны падстройвацца пад магчымасці бюджэту».

Ігар ШЧУЧЭНКА.

160 ПАРАСЯТ ЗГАРЭЛІ НА ФЕРМЕ

Гэта здарылася ў Талачыне падчас начнога пажару на свінагадоўчай ферме, якая належыць індывідуальнаму прадпрымальніку. Паводле папярэдніх звестак, пажар узнік па прычыне кароткага замыкання электраправодкі.

Фота БЕЛТА.

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным ўпраўленні па надзвычайных сітуацыях, парасяты ва ўзросце да трох месяцаў загінулі ў агні яшчэ да прыбыцця пажарных. Калі б своечасова паведамілі пра пажар, страты былі б мінімальнымі. А яшчэ моцны вецер перашкаджаў працы пажарных. Начное дзяжурства на ферме ажыццяўлялі два вартаўнікі. На момант пажару яны былі на працы.

У выніку пажару ў будынку фермы, узведзенай у 1950 годзе, знішчаны дах, стольнае перакрыцце. Папярэдняя страта ацэньваецца ў 30 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ КОНКУРСНЫХ ТОРГОВ

15 марта 2011 года в 11.00 в г. Кобрине (ул. Суворова, 25, каб. 302) состоятся открытые конкурсные торги на право заключения договора аренды охотугодий Леликовско-Повитьевской охотдачи общей площадью 13 415 гектаров, из них: лесных – 5 286 гектаров, полевых – 6 860 гектаров, водно-болотных – 1 269 гектаров (без земель населенных пунктов).

Основной критерий определения победителя конкурсных торгов – наилучшие предложения по рациональному ведению охотничьего хозяйства на территории передаваемых в аренду охотничьих угодий.

Срок аренды охотугодий – 10 (десять) лет.

Победитель торгов обязан возместить затраты по публикации объявления.

Для участия в конкурсе до 14 марта 2011 года необходимо представить:

- заявление по установленной форме и подписанное соглашение с Кобринским райисполкомом;
- конкурсные предложения по рациональному ведению охотхозяйства, запечатанные в отдельном конверте.

Заявки на участие в конкурсе принимаются в рабочие дни **до 16.00 по 14 марта 2011 года** по адресу: 225306, г. Кобрин, ул. Суворова, 25, каб. 412.

Более подробную информацию о проведении аукциона можно получить по телефонам: в г. Кобрине (8 01642) 2 29 58, 2 24 05.

Абзац

Дзяржаўтаінспекцыя Мінска ўзмацняе кантроль за выкарыстаннем рамянёў бяспекі ў аўтатранспарце. Інспектары будуць звяртаць увагу не толькі на кіроўцаў, але і на пасажыраў, у тым ліку і на задніх сядзеннях.

Кіроўца маршруткі, які быў моцна п'яны, трапіў у ДТЗ у Мінску на вуліцы Карбышава. Ён не справіўся з кіраваннем, выехаў за межы дарогі і ўрэзаўся ў асвятляльную мачту. Па словах відавочцаў, у салоне былі два чалавекі, якія адразу ж зніклі. У міліцыі мяркуюць, што гэта маглі быць не пасажыры, а знаёмыя кіроўцы маршруткі. Звестак аб пацярпелых няма. Калі на месца прыбылі супрацоўнікі ДАІ, кіроўца ўпарта адмаўляўся прайсці медагляд. Пасля выявілася, што ў яго крыві выявілі 2,6 праміле алкаголю пры дапушчальнай норме 0,5.

Супрацоўнікі Ашмянскай мытні на пагранічным пункце пропуску «Катлоўка» спынілі футравую кантрабанду агульнай вагой каля 1 т. Кантрабанда была выяўлена ў грузавым аўтамабілі «Мерседэс», якім кіраваў грамадзянін Расіі. Груз накіроўваўся з Літвы ў Расійскую Федэрацыю. Пры даглядзе ў паўпрычэпе «Мерседэса» былі знойдзены схаваныя кардонныя каробкі, абматаныя скотчам. У адной з іх знайшлі футравыя вырабы — шубы і паўкажушкі з норкі, каракулю, пясца. Таксама былі выяўлены шкуркі норкі і адна шкура рысі. Кіроўца не мог патлумачыць, як не заяўлены ў дакументах тавар трапіў у паўпрычэп аўтамабіля. Кантрабандны тавар, папярэднім коштам больш за Br3,6 млрд, канфіскаваны.

Поўны абзац

У ЗША дзвюх сясцёр ва ўзросце 18 і 22 гадоў арыштавалі пасля таго, як яны ўзламалі шкляныя дзверы прадуктовай крамы, зачыненай на ноч, і скралі адтуль дзве скрыні з півам. Аднак кур'ёз заключаецца ў тым, што яны за яго заплацілі. Дзяўчаты адправіліся па чарговую порцыю спіртнога яшчэ звечара. Сярод іншых тавараў яны купілі дзве скрыні піва, за якія заплацілі, аднак не забралі іх. А палове трэцяй ночы яны ўспомнілі пра піва і вырашылі забраць сваю пакупку. Паколькі крама была зачынена, Мерседэс і Шэрыл вырашылі адчыніць дзверы — рассунулі іх з дапамогай рычага. Сёстры забралі сваё піва і ў парку насупраць сталі яго піць. Міліцыя, што прыехала на сігнал аб узломе, лёгка знайшла дзяўчат і арыштавала іх. Магчыма, ім не было б прад'яўлена абвінавачванне, але пры затрыманні яны моцна лаяліся і зневажалі паліцэйскіх, а старэйшая ўмудрылася і пабіць аднаго. Напарадзе — суд.

Жанчына-стаматолаг выкарыстоўвае свае грудзі як абязбольвальны сродак. Марыя Кацярына Кларкоўскі валодае стаматалагічнай клінікай у Мюнхене. Каб зрабіць гэтае месца больш прыемным для сваіх пацыентаў, яна апранула персанал (сябе ўключна) ў сукенкі з глыбокім дэкальтэ. Гэта, на думку 41-гадовай жанчыны-ўрача, дапамагае людзям менш звяртаць увагу на некаторыя малапрыемныя бакі візіту да дантыста. «Рот у некаторых пацыентаў шырока адчыняецца ўжо пры ўваходзе, а гэта якраз тое, што патрэбна стаматолагу», — кажа Кларкоўскі. Яна лічыць, што новая ўніформа з'яўляецца добрым анастэтыкам. Ідэю яна пазычыла ў дзяўчат, якія абслугоўваюць наведвальнікаў піўнога фестывалю Oktoberfest: там афіцыянткі носяць традыцыйны касцюм дзірндль з глыбокім выразам. Мяркуючы па тым, што колькасць наведвальнікаў клінікі павялічылася на трэць, пацыенты задаволеныя не менш, чым персанал.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ОТЧЕТ

Местного фонда «Центр поддержки сельского развития и предпринимательства Столинского района» об использовании своего имущества за 2010 год.

Количество учредителей Фонда – 18, в том числе 15 физических лиц.

Стоимость имущества Фонда, в том числе:

- поступлений от проводимых в соответствии с Уставом Фонда мероприятий – 682034267 руб.,
- доходы от предпринимательской деятельности – 3652000 руб.,
- иные поступления – 2161614 руб.

Сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно-полезных целей, указанных в его Уставе, – 340659870 руб.

Фонд не создавал унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвовал в таких юридических лицах.

Первичная профсоюзная организация ОАО «Технобанк» Белорусского профессионального союза банковских и финансовых работников (УНН 100837345) ликвидируется. Претензии принимаются в течение двух месяцев по тел. (+375 29) 622 20 04.

Гучная справа

Адказваць за несправядлівую адсідку грамадзяніна за кратамі будзе толькі дзяржава?

НЕЗАКОННАЕ асуджэнне Леаніду Тарасенку прапанавалі кампенсаваць сумай у 42 мільёны беларускіх рублёў. А канкрэтных грамадзян, вінаватых у гэтым, так і не пакаралі.

Тым часам Генеральная пракуратура Беларусі настойвае на асуджэнні чалавека, які зрабіў на Тарасенку лжывы данос і даў хлуслівыя паказанні. Судовыя органы — супраць.

Кропку ў гучнай справе ў хуткім часе можа паставіць Прэзідыум Вярхоўнага Суда.

Леанід ТАРАСЕНКА: «Лічу, што кампенсацыю за маё незаконнае знаходжанне за кратамі павінна сплачваць не дзяржава, а канкрэтныя грамадзяне».

Пра пакручасты лёс Леаніда Тарасенкі распавядалася не толькі на старонках «Звязды», але ў іншых аўтарытэтных выданнях. Справа разышлася па інфармацыйнай прасторы і стала па-сапраўднаму гучнай.

Нагадаем, што ў снежні 2003 года ў дачыненні да мужчыны завялі крымінальную справу па артыкулах «хуліганства» і «нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў». Леаніда Віктаравіча абвінавацілі ў тым, што ён збіў рукамі і нагамі жыхара Бараўлянаў. З калоніі мужчына пачаў пісаць скаргі ва ўсе магчымыя інстанцыі — у пракуратуры ўсіх узроўняў, у суды, у Адміністрацыю Прэзідэнта, у парламент...

У выніку праз 14 месяцаў адсідкі мужчыну вызвалілі, а яшчэ праз нейкі час цалкам апраўдалі.

Аказалася, што следчыя дзеянні ў дачыненні да Леаніда Тарасенкі былі праведзены несумленна (хоць службовая асоба, якая гэтым займалася, дагэтуль служыць у праваахоўных органах і займае высокую пасаду). Пералому вяртлужнай упадзіны ў лжэпацярпелага ад удараў рук і ног здарыцца не магло чыста фізічна. Больш за тое, стала вядома, што той самы «пацярпелы» сам справакаваў канфлікт, ударыўшы нагой па машыне Леаніда Тарасенкі і зрабіўшы ўвагнутасць на крыле «Фальксвагена». У 2007 годзе суд Мінскага раёна прызнаў «пацярпелага» вінаватым у гэтым правапарушэнні і пастанавіў выплаціць Леаніду Віктаравічу кампенсацыю.

За незаконнае асуджэнне Леаніда Тарасенкі Міністэрства юстыцыі абавязалі таксама выплаціць важкую кампенсацыю. Толькі сума за «маральныя страты» першапачаткова складала 10 мільёнаў рублёў. Ад гэтых грошай Леанід Віктаравіч адмовіўся і абскардзіў рашэнне суда. Было некалькі судовых разглядаў гэтага фінансавага пытання. У выніку Леаніду Віктаравічу прапанавалі каля 42 мільёнаў беларускіх рублёў (кампенсацыя маральных страт, пакрыццё зарплаты за час адсідкі і іншыя выдаткі).

Пазіцыі пракуратуры і суда кардынальна разыходзяцца

На гэтым справа не скончылася. Пракурорскія органы задаліся пытаннем: калі Леанід Тарасенка трапіў за краты несправядліва, то нехта ж у гэтым вінаваты? Лагічна, што нехта павінен за гэта адказаць.

У 2009 годзе пракуратура Мінскага раёна завяла крымінальную справу па артыкулах «загадзя лжывы данос» (артыкул 400, частка 2) і «загадзя лжывыя паказанні» (артыкул 401, частка 2). У здзяйсненні злачынства абвінавацілі таго самага «пацярпелага» — жыхара Бараўлянаў А., які, на думку следства, *«наўмысна, з мэтай зрабіць хлуслівы данос, звярнуўся да кіраўніка мясцовага следчага аддзела з хлуслівай заявай аб тым, што яго збіў Тарасенка»*.

Тым не менш у маі 2010 года суд Дзяржынскага раёна нечакана апраўдаў грамадзяніна А. *«за недаказанасцю яго ўдзелу ў здзяйсненні злачынстваў»*.

Тады ж пракурор Мінскага раёна Эрнест Койра выступіў на старонках «Звязды»:

—Я лічу, што гэты прысуд незаконны і мы працягнем яго апратэставанне. Мы ў гэтым непахісныя. Лічым, што віна абвінавачнага даведзена цалкам. Што ж атрымліваецца? Суд кажа, што адзін невінаваты і другі невінаваты. Любы звычайны чалавек разумее: нешта тут не так.

Услед за гэтай рэакцыяй касацыйны пратэст на рашэнне суда падрыхтаваў намеснік пракурора Дзяржынскага раёна. Аднак Калегія па крымінальных справах суда Мінскай вобласці пакінула прысуд без змен.

Пасля гэтага пратэст склаў Пракурор Мінскай вобласці Аляксандр Архіпаў, ужо ў Прэзідыум Мінскага абласнога суда.

«Судовыя пастановы па справе нельга прызнаваць законнымі і абгрунтаванымі, і яны падлягаюць адмене з прычыны неадпаведнасці высноў суда, выкладзеных у прысудзе, фактычным акалічнасцям справы і істотнага парушэння крымінальна-працэсуальнага закона, — значыцца у пратэсце. — Прашу прысуд суда Дзяржынскага раёна і пастанову Калегіі па крымінальных справах Мінскага абласнога суда адмяніць, справу накіраваць на новы разгляд у той жа суд іншаму суддзі».

Аднак і на гэты раз прысуд не быў зменены.

У выніку пратэст склала Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь. Зноў жа гісторыя паўтарылася: калегія па крымінальных справах Вярхоўнага суда пакінула пратэст без змен.

Такім чынам, лёс гучнай крымінальнай справы больш-менш праясніцца ў канцы лютага, калі чарговы пратэст Генпракуратуры разгледзіць Прэзідыум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь. Гэта апошняя інстанцыя. Калі прысуд пакінуць без змен, то можна будзе сцвярджаць, што за несправядлівую адсідку Леаніда Тарасенкі расплаціцца выключна дзяржава.

P.S. *Падчас падрыхтоўкі матэрыялаў аб лёсе Леаніда Тарасенкі мы прапанавалі выступіць на старонках «Звязды» і жыхару Бараўлянаў А., які, на думку пракуратуры, даваў хлуслівыя паказанні, і міліцэйскаму следчаму Р., які заводзіў крымінальную справу ў адносінах да Леаніда Віктаравіча. Абодва выказаць свой пункт гледжання адмовіліся.*

Сам Леанід Тарасенка заўсёды ахвотна выступае на старонках прэсы:

— Я лічу, што кампенсацыю павінна сплачваць не дзяржава, а канкрэтныя людзі. Я спадзяюся, што і ў Вярхоўным судзе, і ў Генпракуратуры працуюць дасведчаныя чыноўнікі, якія паспрыяюць таму, каб вінаватых знайшлі і пакаралі.

Яўген ВАЛОШЫН.

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *10 марта 2011 г.*

проводит открытый *аукцион* по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

		Лот 1	Лот 2	Лот 3
1	Адрес земельного участка	Горанский с/с, д. Новое Поле	Горанский с/с, д. Новое Поле	Горанский с/с, д. Новое Поле
2	Кадастровый номер	623681315101000220	623681315101000221	623681315101000222
3	Площадь земельного участка	0,1486 га	0,1479 га	0,1481 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 178 285	1 178 285	1 178 285
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	12 000 000	11 000 000	11 000 000
7	Задаток (рублей)	1 200 000	1 100 000	1 100 000

		Лот 4	Лот 5	Лот 6
1	Адрес земельного участка	Горанский с/с, д. Новое Поле	Горанский с/с, д. Новое Поле	Горанский с/с, д. Новое Поле
2	Кадастровый номер	623681315101000223	623681315101000224	623681315101000225
3	Площадь земельного участка	0,1486 га	0,1479 га	0,1481 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 178 285	1 178 285	1 178 285
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	11 000 000	10 000 000	10 000 000
7	Задаток (рублей)	1 100 000	1 000 000	1 000 000

		Лот 7
1	Адрес земельного участка	Папернянский с/с, д. Лапоровичи
2	Кадастровый номер	623685505101001
3	Площадь земельного участка	0,2063 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 235 513
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	37 000 000
7	Задаток (рублей)	3 700 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **10.03.2011 г.** в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 03.03.2011 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–6 перечисляется на расчетный счет № 3600621020043 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лот 7 – на расчетный счет № 3600621120145 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

— У нас у краіне ў праекціроўшчыкаў самыя нізкія расцэнкі — у параўнанні з Расіяй, тым больш з Захадам. На Захадзе кошт выканання праектна-каштарыснай дакументацыі — да 15 працэнтаў ад агульнага кошту аб'екта, яго каштарыса. У нас — толькі 2 працэнты. Гэтым тлумачыцца, у прыватнасці, той кадравы вакуум, які ўтварыўся ў 90-я гады і які зараз немагчыма запоўніць. Ёсць работнікі праектных арганізацый старэйшага пакалення, сапраўдныя фанаты сваёй справы, якія ў галодныя пасляперабудовачныя гады засталіся ў сваіх інстытутах, не збеглі ў камерцыю, у банкі ці некуды яшчэ. І ёсць моладзь, якая пачала прыходзіць да нас у апошнія пяць гадоў, калі з'явіліся аб'ёмы, яна — як лялечка, там вядзецца мантаж сучаснага медыцынскага абсталявання. Мы настаялі, каб вынесці харчблок у новую прыбудову, з галерэяй-пераходам. Узведзены асобныя лабараторны і стэрылізацыйны карпусы, і ўсё гэта разгрузіла саму бальніцу, яна зможа больш прымаць маленькіх пацыентаў.

Начальнік аддзела генплана Вольга СЫРАКВАШ.

Можна ганарыцца домам-інтэрнатам у Чэрвені. Комплексам санаторыя «Спутнік» «Беларусбанка» на Нарачы, над далейшым пашырэннем якога мы працягваем працаваць разам з яго надзвычай актыўнай дырэкцыяй. Запраектавалі пяць спальных карпусоў, на чарзе яшчэ шэсць такіх жа сімпатычных драўляных катэджаў. Зрабілі ім новую гаспадарчую зону з пральняй, адрамантавалі кацельню з энергаўстаноўкай, якая забяспечыць электраэнергіяй і суседнія здраўніцы. Там будзе свой спа-цэнтр з даволі рэдкімі працэдурамі, гразелячэбніца, канцэртная зала, рэстаран. Ужо зараз у іх ніколі месцаў няма, а пасля пуску ўсяго комплексу папулярнасць санаторыя ўзрасце яшчэ больш.

Альбо чаму не ганарыцца басейнам-прыгажуном у Маладзечне і такім жа сучасным басейнам у Вілейцы, на якіх мы ўпершыню прымянілі фасады, што вентылююцца, новыя аддзелачныя матэрыялы, новыя чыста «басейнавыя» тэхналогіі? Гэта сапраўдныя аквапаркі, адпачываць у якіх — адно задавальненне.

— У вас вялікія аб'ёмы па жыллі. Як вы лічыце, наколькі сучаснае жыллё вы праектуеце?

— Планіроўка цалкам сучасная, як і архітэктура, яны адпавядаюць нормам і нарматывам, выконваюцца з улікам пажаданняў заказчыкаў, асабліва калі гэта жыхары будучых дамоў ЖБК. Побач з жыллём, калі праектуецца новы мікрараён, поўны набор сацыяльных даброт — школы, дзіцячыя дашкольныя ўстановы, прадпрыемствы гандлю, медыцынскія ўстановы і гэтак далей. Нават тыя ж грамадскія лазні і пажарныя дэпо. Усё гэта прадугледжана ў нашых праектах падэталёвай планіроўкі. Вядзём папярэдні разлік — колькі якіх аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры на той ці іншы мікрараён патрэбна прадугледзець, у залежнасці ад будучай колькасці насельніцтва. Напрыклад, запланавана праектаванне і будаўніцтва двух дзіцячых садкоў для 11-га мікрараёна Маладзечна, трох садкоў для 7-га і 9-га мікрараёнаў.

Бачыце, адлік новых раёнаў нашага горада ўжо «пераваліў» на другі дзясятак. Маладзечна актыўна будуецца, як і ўся краіна.

Толькі што закончылі значныя па аб'ёме работы на буйным мікрараёне «Усходні» — на выездзе з горада на Мінск. Там складаная структура грунтоў, прымянялі і палевыя, і лентачныя фундаменты. А побач, справа, будзе яшчэ адзін мікрараён, ужо выконваюцца сеткі. І яшчэ адзін вырасце побач з заводам парашковай металургіі... Так што пасля «Дажынак» нас чакае сапраўдны вал новага будаўніцтва жылля.

З задавальненнем займаемся сацыяльным «пакетам» для вёскі, калі такія заказы паступаюць. Цяпер, у асноўным, праектуем рэканструкцыю тых аб'ектаў, якія пабудаваны ў 80-х гадах.

І пра сучасны твар вясковых вуліц клапоцімся. Калі населены пункт «прырастае», скажам, на 20 дамоў, то прымяняем розныя планіровачныя рашэнні, каб пазбегнуць аднастайнасці. Калі па ўзгадненні з заказчыкам за аснову бяруцца тыя ці іншыя тыпавыя праекты, то на адной вуліцы іх будзе пяць, а не адзін. І з той жа мэтай — каб пазбегнуць аднастайнасці — уносім змены ў самі тыпавыя праекты: мяняем фасады будынкаў, нейкую дэталізацыю, каляровую палітру.

— Калі ўспомніць, то біяграфія калектыву ў свой час і пачыналася на аб'ектах беларускай вёскі... Дарэчы, а навошта спатрэбіўся ў далейшым цэлы праектны інстытут у рэгіёне?

— Яго фарміраванне не ішло плаўна па нарастаючай. Спачатку, у 1968 годзе, гэта была праектна-каштарысная майстэрня Мінскаблсельбуда з параўнальна невялікім штатам, свайго будынку не мелі, размяшчаліся на арандаваных плошчах. Я прыйшла сюды працаваць у 1988 годзе. Тады ўжо вялося будаўніцтва ўласнага офіса, адначасова адбываліся арганізацыйныя змены, мянялася кіраўніцтва. Тады было вельмі многа работы, і калектыў вырас да ста чалавек. У 1990-м перайшлі ва ўласны будынак, з настроем працаваць і працаваць. Але ў 91-м у грамадстве пачаліся вядомыя працэсы, якія адбіліся і на нас. Было цяжка, але выстаялі, захавалі касцяк калектыву. Са ста чалавек засталіся прыкладна трыццаць, але якія... Разам праз усё прайшлі. Здавалі ў арэнду ўласныя плошчы, у нас размяшчаліся мытня, прыватныя фірмы. Шукалі сабе любую работу, нават у аддаленых раёнах, я гэтым таксама актыўна займалася ў якасці галоўнага інжынера праекта (ГІПа) і вяла значную колькасць аб'ектаў. У 1998-м мяне выбралі дырэктарам. Шчыра кажучы, не вельмі хацела, бо былі малымі мае дзеці. І асабіста для мяне пачаліся яшчэ больш напружаныя будні.

Калі сітуацыя ў эканоміцы маладой краіны выраўнялася, у рэгіёне разгарнуўся фронт будаўнічых работ. Нашы кадры і наш вопыт спатрэбіліся, мы сталі развівацца і адчуваем сябе запатрабаванымі.

А пачыналі некалі сапраўды з праектавання домікаў для вёскі, жывёлагадоўчых фермаў — і ў сталічнай вобласці, і ў суседняй Гродзенскай. У апошнія гады ўдзельнічалі ў праектаванні аграгарадкоў — такая вось эстафета.

— Геаграфічна побач з вамі знакамітае возера Нарач і не вельмі далёка — Белавежская пушча. У абедзвюх гэтых слынных мясцін — бліскучая перспектыва...

— Мы ў пэўнай ступені працуем над яе набліжэннем. Пра праектаванне санаторыяў я коратка ўпамінала. Дадам, што працавалі з санаторыямі «Нарач», «Прыазёрны», «Сосны» — праектуем ім новыя карпусы, пастаянна мяняем ім сеткі. Наогул, даўно і ахвотна працуем са здраўніцамі на Нарачы, уносім свой уклад у развіццё гэтай унікальнай зоны адпачынку.

Мы фактычна заняты ў кожнай здраўніцы. Акрамя таго, па праграме аздараўлення Нарачы выканалі цалкам новы абвадны калектар навокал самага буйнога возера Беларусі, адвялі ад яго ўсе стокі. Гэта быў наш праект, калектар будавалі даволі доўга, і па значнасці, па ступені ўздзеяння на экалогію яго можна назваць грандыёзным. Таму і кантроль за будаўніцтвам быў вельмі строгім.

І ў вытворчасці, і ў спорце маюць поспех маладыя начальнікі аддзелаў пажарнай аўтаматыкі і слабаточных сетак Міраслаў ТАРГОВІЧ і тэхналагічнага Аляксей ФІЛІПАЎ.

Займаемся добраўпарадкаваннем курортнага пасёлка Нарач. У райцэнтры добраўпарадкуем мікрараён, які раней запраектавалі. А яшчэ ў Мядзеле па нашым праекце будуецца фізкультурна-аздараўленчы камбінат (ФАК), пабач — гасцініца, вельмі прыгожа рэканструявалі аўтастанцыю.

У нас цудоўныя адносіны з кіраўніцтвам Мядзельскага раёна, з дырэкцыяй нацыянальнага парка, мы заўсёды ідзём ім насустрач. Як і нацыянальнаму парку «Браслаўскія азёры» на Віцебшчыне. Дзякуючы чаму на азёрах пабудаваны дзве сучасныя базы для адпачынку.

А будуць заказы з Белавежжа — прымем да выканання з вялікай ахвотай, з разуменнем ролі і месца пушчы ў жыцці Беларусі.

— Сёлета Маладзечна стане сталіцай рэспубліканскага свята «Дажынкі». Гэта азначае толькі адно: работы ў вас дабавілася ў разы, ці не так?

— Абсалютна правільна. Нам даручаны ўвесь цэнтр горада: рэканструкцыя цэнтральнай плошчы, пешаходнай вуліцы імя Прытыцкага — яна будзе надзвычай прыгожай, у мармуры. Насупраць кінатэатра «Радзіма», які зараз таксама рэканструюецца, з'явіцца прыгожы гарадскі гадзіннік. А на выездзе з горада — аўтамабільная развязка, якую ўпрыгожыць выкананы ў нацыянальных традыцыях помнік Маці — абаронцы горада.

Плюс рэканструкцыя цэнтральнага парка і тэрыторыі навокал яго. На цэнтральнай плошчы з'явіцца прыгожы фантан, сапраўдная водная феерыя. А ў парку — амфітэатр на тры тысячы гледачоў і лыжа-ролерная траса, цалкам абновяцца зона атракцыёнаў і спартыўныя пляцоўкі. Тут мяняюцца таксама ўсе сеткі і асвятленне. Мясцовае прадпрыемства робіць літыя канструкцыі для прыгожай агародж ы з ліцця.

Так што «другое жыццё» ўсяму цэнтру сталіцы «Дажынак» праектуем мы, разам са сталічнымі калегамі. Тут выконваем добраўпарадкаванне і замену гарадскіх сетак. Выканалі пашпарты пафарбоўкі дамоў. Будуць абноўлены іх фасады, узмоцнены лоджыі і балконы, заменена дахавае пакрыццё. Дызайнпраект Лядовага палаца таксама наш, як і сеткі да яго, асвятленне, добраўпарадкаванне тэрыторыі.

Акрамя таго, у рамках падрыхтоўкі да «Дажынак» нам даручана запраектаваць гасцініцы ў Мядзеле і Валожыне, каб гасцям было дзе спыніцца. Мы гэтыя праекты выканалі, яны на экспертызе.

На частку іншых аб'ектаў праектна-каштарысная дакументацыя прайшла ўжо экспертызу, каб будаўнікі маглі пачаць работу.

— Ці выраслі за апошнія гады ў інстытута аб'ёмы работ? І за кошт чаго ў першую чаргу?

— Аб'ёмы работ узраслі адчувальна, перш за ўсё за кошт інтэнсіфікацыі ўзвядзення жылля ў рэгіёне. У тым ліку актывізацыі ўзвядзення дамоў ЖБК і долевага будаўніцтва шматкватэрных дамоў. А дзе новае жыллё, там і разгалінаваныя сеткі да яго. Шырацца раёны індывідуальнай забудовы — РІЗы. Напрыклад, у нашым

Інжынеры-геадэзісты Юрый СТРАХ, Валерый ГРАБОЎСКІ, Павел КОЙРА, Валерый БЫЧКОЎСКІ і тэхнік Надзея БЯРЭЗІНА.

Такой будзе гасцініца ў курортным пасёлку Нарач.

Старшы інжынер аддзела генплана Валянціна БАЧУРЫНА з маладымі архітэктарамі Юліяй СУТКАЛЕНКАЙ, Мікітам КІРЫЛІЧАВЫМ, Мартай КАРНІЦКАЙ і Таццянай ГУЛЯНКОВАЙ.

Будынак любога банка павінен выглядаць вось так прэзентабельна.

Галоўны інжынер праекта Леанід МАКАРАНКАЎ.

горадзе распрацавалі раён індывідуальнай забудовы Сілівонаўка на 400 дамоў і іншыя раёны, а да іх усе сеткі. Некалькі мікрараёнаў распрацавалі ў Дзяржынску, Валожыне, і ўсе з сеткамі.

— З чым вы звязваеце перспектывы ўласнага калектыву?

— Перш за ўсё з эфектыўным выкананнем жыллёвай праграмы ў гарадах сталічнай і суседніх абласцей. З актыўным будаўніцтвам грамадскіх будынкаў, тых жа ФАКаў у кожным раённым цэнтры (мы распрацавалі праекты параўнальна недарагіх ФАКаў з басейнамі, з трэнажорнымі і трэніровачнымі заламі). З працягам прэзідэнцкай праграмы па ўзвядзенні дамоў на вёсцы. З будаўніцтвам і рэканструкцыяй жывёлагадоўчых комплексаў і фермаў... Наша работа — люстэркавае адлюстраванне тых працэсаў, якія адбываюцца ў эканоміцы і сацыяльным жыцці краіны. Актыўней працуе рэальны сектар — узрастае нагрузка на нас, і супраць гэтага складана пярэчыць.

Ад нас патрабуецца нарошчваць тэмпы работ за кошт большай тэхнічнай узброенасці, прафесійнай падрыхтоўкі калектыву. Калектывам сваім я задаволена, перш за ўсё старажыламі, якія засталіся, як бы цяжка ні было ў пасляперабудовачныя гады. У асноўным, людзі ўсе працуюць прафесійна і старанна. Кожны жадае зрабіць нешта вартае ўвагі, каб засталося на гады. Стараецца не адставаць і моладзь, якой у нас зараз шмат. І з ёю мы звязваем свае надзеі. Маладым ёсць у каго вучыцца, а старэйшыя, больш вопытныя, таксама не «варацца ва ўласным саку». Нашы спецыялісты шмат ездзяць, бываюць за мяжой, удзельнічаюць у выставах і семінарах, у разнастайных праграмах, цікавяцца напрацоўкамі калег.

Мы клапоцімся не толькі пра «багаж ведаў» спецыялістаў, але і аб сацыяльным пакеце для членаў калектыву. У людзей неблагая зарплата. Летась пабудавалі для сваіх супрацоўнікаў у цэнтры горада пяць кватэр, дзве аднапакаёўкі аддалі маладым сем'ям, а ў трох трохпакаёвых адкрылі новы інтэрнат (у нас ужо былі месцы ў інтэрнатах — уласным на восем пакояў і ў будаўнікоў, за што асобнае і шчырае дзякуй кіраўніцтву «Аблсельгасбуда»). Абсталявалі пакоі належным чынам, у тым ліку мэблевымі наборамі для кухні, халадзільнікамі. І ў кожны пакой засялілася свая гаспадыня. Аплачваем членам калектыву наведванне фітнэс-клуба, басейна, курсаў англійскай мовы, масажнага кабінета, што важна, бо работа ва ўсіх — сядзячая. А яшчэ — канцэртаў зорак беларускай і расійскай эстрады. Той, хто ўмее працаваць, павінен умець і адпачываць.

Аддзел абследавання будынкаў: другі злева — начальнік аддзела Аляксандр МАЛЕВІЧ; інжынеры Сяргей АНДРУШКЕВІЧ, Алена НАЙДЗІЧ, Міхаіл БЯСЕДЗІН і Ганна САЎЧАНКА.

СЛОВА — ПРАДСТАЎНІКАМ ПРАЦОЎНАГА КАЛЕКТЫВУ

«ПРАПІСКУ» АБ'ЕКТУ ДАЁМ МЫ...

Расказвае намеснік начальніка геадэзічнага аддзела Ігар КАПУЦКІ:

— Аддзел выконвае геадэзічныя здымкі мясцовасці пад будучае будаўніцтва, каб праекціроўшчыкі маглі выбраць найлепшы варыянт размяшчэння аб'екта і сетак да яго. У аддзеле, у асноўным, моладзь, якая няблага асвоіла сваю прафесію. Самы малады — Юра Страх — і то працуе чатыры гады. Гэта тэрмін дастатковы, каб разабрацца, што да чаго. Галоўным чынам, усе спецыялісты з вышэйшай адукацыяй — выпускнікі геафака БДУ, профільных факультэтаў БНТУ, наваполацкага політэхнічнага ўніверсітэта. Прыемна, што зараз падрыхтоўка патрэбных нам кадраў вядзецца ў многіх беларускіх ВНУ, раней такога не было.

Моладзь, як вядома, лёгкая на пад'ём, што важна, бо характар работы — раз'язны. Пачынаецца рабочы дзень — спецыяльную апаратуру на плячо, і па машынах. За аддзелам замацаваны тры легкавыя аўтамабілі для выезду на аб'екты, гэта значна дапамагае ў рабоце. Тым больш, што адрасы такіх амаль штодзённых камандзіровак — добрая палова Беларусі.

Мы выконвалі тапаграфічныя здымкі пад Палац спорту ў Маладзечне, для рэканструкцыі парку Перамогі, пад шматлікія аб'екты ў курортным пасёлку Нарач і на воручана тэрмінова запраектаваць жыллё для перасяленцаў на Магілёўшчыне, у Мсціслаўскім раёне — у чыстым полі, і адразу на 300 дамоў. Узвядзенне вялося, што называецца, з ліста, не паспявалі аддаваць будаўнікам чарцяжы. Зараз там жывуць людзі, ужо многа гадоў.

Потым паступова перайшлі на гарадское жыллё — на праектаванне шматпавярховых дамоў. А гэта ўжо «вышэйшы пілатаж». У многіх гарадах Міншчыны стаяць нашы мікрараёны, там таксама шчасліва жывуць людзі, што выклікае пачуццё прафесійнай задаволенасці.

Супрацоўнікі аддзела цеплагазазабеспячэння і вентыляцыі Вольга КУРГАН, Ала ТАКМАКОВА, Сяргей ЦЭЛІКАЎ, Алена ЗАХАРАВА і Станіслава ЧАПСКАЯ.

Аляксей ДЗЕВЯЦЕНЬ, Аляксей ДВОРСКІ, Святлана ЧАЕЎСКАЯ і Алена САКАЛОЎСКАЯ працуюць у электратэхнічным аддзеле.

зеры, мікрараёна «Усходні» — усіх тых аб'ектаў, пра якія вам распавядала Вольга Рыгораўна. Без нас нічога не бывае, ніякай будоўлі. За намі ідуць геолагі і іншыя аддзелы інстытута.

ТВОРЦУ ЖЫЦЦЁ РАДУЕ

Гаворыць галоўны інжынер праекта (ГІП) Леанід МАКАРАНКАЎ:

— У інстытуце я амаль 40 гадоў. Прыйшоў сюды пасля заканчэння вучобы ў інстытуце і службы ў арміі. Заспеў той час, калі праектавалі, у асноўным, машынныя двары і фермы для калгасаў, збожжавыя такі і складскія памяшканні. Ні ў якое параўнанне з сённяшнімі магчымасцямі калектыву тое не ідзе. Яго сталенне ішло адначасова з вырашэннем тых складаных задач, якія стаялі перад вялікай краінай. Я маю на ўвазе, што першы вопыт праектавання буйных жылых пасёлкаў мы атрымалі адразу пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, калі інстытуту было даручана тэрмінова запраектаваць жыллё для перасяленцаў на Магілёўшчыне, у Мсціслаўскім раёне — у чыстым полі, і адразу на 300 дамоў. Узвядзенне вялося, што называецца, з ліста, не паспявалі аддаваць будаўнікам чарцяжы. Зараз там жывуць людзі, ужо многа гадоў.

Потым паступова перайшлі на гарадское жыллё — на праектаванне шматпавярховых дамоў. А гэта ўжо «вышэйшы пілатаж». У многіх гарадах Міншчыны стаяць нашы мікрараёны, там таксама шчасліва жывуць людзі, што выклікае пачуццё прафесійнай задаволенасці

Дзіцячая тэма

НЯХАЙ ЗАЎСЁДЫ БУДЗЕ СУХА!

(Заканчэнне.
Пачатак у нумары за 8 лютага.)

Калі для самога дзіцяці або ўсёй сям'і мокрыя пялёнкі становяцца крыніцай стрэсу, з гэтым трэба змагацца.

«НЕ ДРАЖНІЦЬ» — ГАЛОЎНАЕ ПРАВІЛА

Эксперты адзіныя ў меркаванні, што ў сям'і, дзе дзіця пакутуе ад энурэзу, павінна быць уведзена забарона на насмешкі. Ніхто (асабліва браты і сёстры) не павінен смяяцца з хворага дзіцяці. Іншым дзецям трэба растлумачыць, што брат або сястра мочыцца ў пасцель не знарок, і насмешкі не толькі не дапамогуць, але і нашкодзяць яму (ёй). Не трэба таксама кожны раз паведамляць усім дамачадцам, што малое намачыла прасціну.

ПАЗІТЫЎНЫ НАСТРОЙ ДАПАМОЖА ВАШАМУ ДЗІЦЯЦІ

З дзіцем, хворым на энурэз, лепш размаўляць сам-насам, паколькі яно можа саромецца іншых членаў сям'і. Згодна з даследаваннямі, многія дзеці спрабуюць утаіць сваю праблему і лічаць, што з імі нешта не так. Усведамленне таго, што прычынай праблемы з'яўляецца захворванне, вызваляе дзіця ад комплексу віны. Эфект можа даць нават простая змена рэжыму дня. Можна паспрабаваць абмежаваць ужыванне ежы пасля 18.00, выключыць з рацыёну дзіцяці прадукты і напоі з кафеінам (гэтае рэчыва валодае мачагоннымі ўласцівасцямі), газаваныя напоі і сок цытрусавых. Вельмі важна заахвочваць дзіця схадзіць у прыбіральню перад сном.

УЦЯГВАЕМ ДЗІЦЯ Ў ПРАЦЭС ЛЯЧЭННЯ

Пакуль малы не «перарасце» праблему энурэзу, можна на час сну падкладаць паміж прасцінай і матрацам кляёнку. Гэта засцеражэ пасцель ад паху мачы. Урачы рэкамендуюць прасціць дзіця самастойна мяняць мокрыя прасціны і коўдру. Гэта развівае пачуццё адказнасці і змяншае страх дзіцяці, што ўсе астатнія члены сям'і даведаюцца аб яго «прамашцы». Праўда, калі на іншых членаў сям'і такія абавязкі не ўскладзеныя, малое можа ўспрыняць просьбу мяняць пасцельную бялізну як пакаранне. У гэтым выпадку лепш не выкарыстоўваць апісаны прыём.

БУДУЧЫНЯ ХВОРАГА ДЗІЦЯЦІ

Энурэз не наносіць шкоды здароўю дзіцяці. І ўсё ж, каб супакоіцца і выключыць наяўнасць захворвання (дыябету, інфекцыі мочавыдзяляльнай сістэмы і да т. п.), абмяркуйце гэтую праблему з педыятрам. Пры падазрэнні на захворванне спатрэбяцца аналіз мачы, рэнтгенаўскае даследаванне нырак або мачавога пузыра.

НАПАМІНАК ДЛЯ БАЦЬКОЎ

❐ Амаль усім дзецям рана або позна дапамагае той ці іншы від лячэння або іх камбінацыя. Часам бацькі занадта моцна занепакоеныя энурэзам у дзіцяці. Педыятры заклікаюць быць цярплівымі, бо энурэз не можа знікнуць раптоўна.

❐ У хворых на энурэз часта бывае заніжаная самаацэнка і ўзнікаюць псіхалагічныя комплексы ў сувязі з нетрыманнем мачы. Бацькі павінны растлумачыць, што энурэз з'яўляецца хваробай, якая з часам пройдзе.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Адказы на сканворд

Па гарызанталі: Аўтамагістраль. Ружа. Зму. Нара. Сіцар. Рута. Указ. Анён. Рамантыка. Навара. Ака. Нітар. Намінал. Ноч. Док. Асака. Кашара. Бар. Разгі. Яскі. Зебра. Свят. Капона. Дарн. Ната. Тыгр. Шарнір. Зака. Шмат. Набой. Ліра. Чарнак. Мэра. Анока. Кнір. Чарнак. Воляр. Ар-рысцінг. Бурунджук. Воляр. Ар-ка. Гранат. Дзяр. Енк. Тагаш. Апазі. Кіт. Ёмка. Атава. Шыя. Анаконда. Ера. Аорта. Шуга. Енка. Крайда.

Па вертыкалі: Скагарыя. Зака. Шмат. Набой. Ліра. Чарнак. Мэра. Анока. Кнір. Чарнак. Воляр. Ар-рысцінг. Бурунджук. Воляр. Ар-ка. Гранат. Дзяр. Енк. Тагаш. Апазі. Кіт. Ёмка. Атава. Шыя. Анаконда. Ера. Аорта. Шуга. Енка. Крайда.

Фота БЕЛТА.

Кіроўцы абыякавыя да п'яных

Магілёўская Дзяржаўтаінспекцыя правяла эксперымент: як аўтамабілісты адрэагуюць на п'янага пешахода? Вынікі ўражваюць!

Сыграў п'янага пешахода дружыннік, якому для завяршэння вобраза далі ў руку бутэльку ад гарэлкі. Інспектары дарожнага руху назіралі за сітуацыяй і вялі здымкі з прыдарожнай кавярні. «П'яны» вельмі перакананча хістаўся на трасе «Магілёў—Мінск»: сядзеў і хадзіў на абочыне, выскоквай на сярэдзіну трасы, нават падаў.

Аднак за гадзіну эксперыменту ніводны вадзіцель так і не патэлефанаваў у дзяжурную часць ДАІ альбо ў міліцыю. Людзі за рулём, наадварот, імкнуліся абмінуць п'янага і па-рознаму рэагавалі на яго — лаяліся, смяяліся і круцілі пальцам ля скроні, але ніводны аўтамабіліст так і не паклапаціўся пра тое, каб нецвярозага чалавека ўвогуле прыбралі з дарогі, пакуль з ім не здарылася бяда.

Ілона ІВАНОВА.

10 лютага

Дзве даты

1874 год — нарадзіўся (в. Шаршні Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобл.) Язэп Юр'евіч Філідовіч, удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Дзятлаўскага раёна, герой Вялікай Айчыннай вайны. З вясны 1942 года разам з сынам Іванам быў праваднікоm і сувязным першых партызанскіх груп. Увосень дапамог партызанам абсталяваць шпіталь на востраве сярод незамярзальнага балота, куды разам з сынам па вядомай толькі ім пераправе дастаўлялі параненых, медыкаменты і прадукты харчавання. 16 снежня 1942 года карнікі пад пагрозай расстрэлу ўсёй сям'і запатрабавалі адвесці іх да шпіталя. Філідовіч завёў нямецкі атрад у непраходнае балота, адкуль многія з фашыстаў так і не выбраліся, сам ён быў забіты. Пасмяротна ўзнагароджаны медалём «За адвагу». У Дзятлаве яму ўстаноўлены помнік.



1890 год — нарадзіўся Барыс Пастэрнак, рускі паэт, перакладчык, мемуарыст. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1958). Яго вершы напоўнены рознымі асацыяцыямі, пабудаваны на ўражаннях аўтара, незвычайныя па вобразах, складаныя па мове. Аўтар аповесцяў «Дзевяцьсот пяты год», «Лейтэнант Шміт», рамана «Доктар Жывага» і іншых твораў.

Цытата дня:

«Будзем смяяцца, не чакаючы мінуты, калі адчуем сябе шчаслівымі — інакш мы рызыкуем памерці так ні разу і не засмяяўшыся».

Жан дэ Лабруер (1645—1696), французскі пісьменнік.

Общество с ограниченной ответственностью «Эргоном-М»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества (с уценкой на 20 % от начальной стоимости):

№ лота	Наименование имущества	Место нахождения имущества	Собственник	Начальная цена продажи лота, рублей (без учета НДС)	Задаток 5 %, рублей (без учета НДС)
	ИМУЩЕСТВА (без учета НДС)				
1	**Лот №1 – транспортное средство «Опель Кампо», 2007 года выпуска, тип ТС – грузовой фургон, количество мест – 2; тип двигателя – CDTI, объем 1 686 см³, мощность 100 л.с.**	**г. Гомель, ул. Малайчука, 1**	**ООО «Эргоном-М»**	**21 325 600**	**1 066 280**

Организатор торгов – Антикризисный управляющий ООО «Диспонент», в лице директора Пантелеевой Лилии Николаевны.

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 8.00 до 17.30.

Задаток перечисляется до 25.02.2011 г. (включительно) на № 3012343790010, в филиале № 6 ЗАО «ВТБ Банк», код банка 153001108, УНП 490178164.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 9 % от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае, если на участие в аукционе поступила от претендента одна заявка, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления **до 16.00. 25.02.2011 года** по адресу: г. Гомель, ул. Шилова, 2, ком. 2.

Дата, время, место проведения открытого аукциона **28.02.2011 года в 12.00**, г. Гомель, ул. Шилова, 2, ком. 2.

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8029) 621 22 36 или (80232) 60 51 31.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.41	17.08	9.27
Віцебск —	7.34	16.54	9.20
Магілёў —	7.31	16.58	9.27
Гомель —	7.23	16.59	9.36
Гродна —	7.55	17.24	9.29
Брэст —	7.51	17.29	9.38

Месяц

Першая квадра 11 лютага. Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Ісака, Паўла, Уладзіміра, Фёдара, Яфрэма.*

К. *Схалыстыкі, Элізы, Эльвіры, Габрыеля, Яцка.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



Усміхнемся

Пацыент прыйшоў да ўрача:
— Доктар, вы раілі мне, каб заснуць, лічыць да 10000!
— Ну і як, заснулі?
— Не, наступіла раніца!

Двое сяброў.

— Уяўляеш, учора ездзіў на паляванне і забыўся ўзяць з сабой стрэльбу.

— Гэта непрыемна. І калі ты пра гэта ўспомніў?

— На жаль, толькі тады, калі прынёс жонцы зайца...

Нарада па барацьбе з п'янствам. Дырэктар — начальніку цэха:
— Дакладзіце аб прынятых мерах.

Начальнік цэха:
— Дакладваю, меры прынятыя.
Дырэктар:
— Якія?
Начальнік цэха:
— Дык жа ў кожнага свая.

К сведению акционеров ОАО «Универсам «Северный»
21 февраля 2011 года в 10.00 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3. Регистрация участников с 9.00 до 9.45.

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об утверждении передаточного акта.
2. Об утверждении расчета обмена простых (обыкновенных) акций ОАО «Универсам «Северный» на акции дополнительного выпуска ОАО «Родные истоки».
3. Об утверждении списка акционеров ОАО «Универсам «Северный», обладающих правом на участие в совместном собрании акционеров реорганизуемых Обществ.
4. Об утверждении договора о присоединении.

Акционер Общества принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности. Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт и доверенность. Дата составления реестра акционеров для регистрации участников собрания — 14 февраля 2011 года.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по указанному адресу в период с 14 февраля 2011 года с 10.00 до 17.00, а в день проведения собрания — в помещении, где оно проводится.

Телефон для справок: 017 261 04 99.

УНП 100356386 Совет директоров.

К сведению акционеров ОАО «Универсам «Северный»
21 февраля 2011 года в 13.00 СОСТОИТСЯ СОВМЕСТНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Родные истоки» и ОАО «Универсам «Северный» по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3. Регистрация участников с 12.00 до 12.45.

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об утверждении решения об обмене акций.
2. Об утверждении решения о выпуске дополнительных акций ОАО «Родные истоки».
3. Об увеличении размера уставного фонда ОАО «Родные истоки».
4. Об утверждении новой редакции Устава ОАО «Родные истоки».

Акционер Общества принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности. Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт и доверенность. Дата составления реестра акционеров для регистрации участников совместного собрания — 14 февраля 2011 года.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по указанному адресу в период с 14 февраля 2011 года с 10.00 до 17.00, а в день проведения собрания — в помещении, где оно проводится.

Телефон для справок: 017 261 04 99.

УНП 100356386 Совет директоров.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 6 (385)

Як прышчапіць вішню?

«У садзе расце трохгадовае дрэва вішні. Хацеў бы прышчапіць іншы гатунак. У які тэрмін гэта зрабіць і якім спосабам?»

М. Доліч, *Старобінскі раён*

Калі вы хочаце перапрышчапіць маладое вішнёвае дрэўца іншым гатункам, пастарайцеся не спазніцца. Лепшы тэрмін перапрышчэпкі костачкавых культур — да пачатку руху соку ці ў першыя яго дні, калі ўжо адстае кара. У гэтым выпадку, раяць спецыялісты, можна скарыстацца трыма спосабамі: прышчэпкай за кару, упрыклад, або простай капуліроўкай. Пры выкарыстанні капуліроўкі таўшчыня прышчэпы (галінкі на дрэве) і прышчэпкі (чаранка) павінна быць адналькавая — каля 1 см. На прышчэпе і чаранку робяць касыя зрэзы даўжынёй не менш як 3 см. Затым злучаюць іх так, каб супалі слаі камбію. Месца прышчэпкі абвязваюць поліэтыленавай стужкай. Верхні зрэз чаранка змазваюць садовым варам.

Прышчэпку ўпрыклад робяць у тых выпадках, калі прышчэпа не таўшчэйшая за чаранок. Прышчэпку спосабам за кару на костачкавых культурах праводзяць у самым пачатку руху соку ў дрэве. У гэтым выпадку прышчэпа павінна быць значна таўшчэйшая за прышчэпку (чаранок).

Звычайна чаранкі нарыхтоўваюць у канцы лістапада — пачатку снежня, але калі аднагадовыя галінкі не падмерзлі, можна нарэзаць іх і ранняй вясной. Чаранкі, у якіх абудзіліся і прараслі пупышкі, для перапрышчэпкі не падыходзяць. Перапрышчэпку вішні трэба праводзіць асабліва старанна і хутка, а ў гарачае надвор'е ад гэтай аперацыі лепш адмовіцца.

Прышчэпа і прышчэпка зрастуцца хутчэй, калі на тарэц перапрышчэпленай галінкі надзець поліэтыленавы пакет, на 10—12 см даўжэйшы за чаранок. Каб пакет не пераграваўся, на яго надзяваюць шырокі цыліндр, зроблены з двух слаёў шчыльнай белай паперы. Як правіла, праз 25—30 дзён на прышчэпленых чаранках з'яўляюцца лісты, і тады можна знімаць укрыццё. Спачатку пакет раскрываюць зверху, а праз тыдзень можна здымаць зусім.

Вядомыя антысептыкі

Многія травы валодаюць антысептычнымі ўласцівасцямі. Перад тым як вынайшлі халадзільнікі, у вялікіх гаспадарках, ды і ў малых таксама, мяса захоўвалася ў склепах загорнутым у свежыя лісты шалфею. Вярнуўшыся з палявання, паляўнічыя вывешвалі здабытае мяса з пучкамі чабору, каб яно стала больш мяккім. Чабор выкарыстоўвалі не толькі для таго, каб надаць мясу водар ці прыемны пах, але і дзеля яго антысептычных уласцівасцяў, якія прадухілялі расстройства страўніка пры ўжыванні дзічыны.

Дэльфініум у цэнтры клумбы і на газоне

Адна з раслін з вельмі прыгожымі кветкамі даволі рэдкай афарбоўкі і формы, якую любяць кветкаводы, — гэта дэльфініум. Шматгадовая марозастойкая і засухаўстойлівая расліна, вышыня якой дасягае 2 м, мае паўмахровыя буйныя яркія кветкі. Расліна добра расце на сонечных месцах, ахаваных ад ветру, але некаторыя гатункі любяць цень, бо на сонцы яны выгараюць.

Насенне дэльфініуму высяваюць вясной, у маі ў адкрыты грунт. Для гэтага выбіраюць невялікую градку, дабаўляюць на 1 кв. м 2 кг перагною і торфу, з мінеральных угнаенняў — 1 ст. л нітрафоскі і 100 г драўнінна-га попелу. Градку перакопваюць, робяць баразёнкі, паліваюць, сеюць насенне. Засыпаюць невялікім слоем (1 см) прасеянай зямлі, злёгку ўтрамбоўваюць рукой. Прама на градку кладуць лёгкі ўкрыўны матэрыял. Паліваюць пасевы зверху па матэрыяле кожныя 2—3 дні. Укрыўны матэрыял здымаюць пасля з'яўлення ўсходаў, а яны з'яўляюцца праз 20—25 дзён. Расліны даглядаюць на працягу лета: падкормліваюць, паліваюць, рыхляць. Вясной наступнага года расліны рассаджваюць на пастаяннае месца. Расаду можна вырошчваць вясной у сакавіку ў скрынках або гаршках і ў чэрвені высаджваюць у грунт. Калі пасеяць рана, цвіценне магчыма ў першы год. На працягу лета неабходна праводзіць рэгулярны паліў раслін пад корань, не дапускаючы, каб вада трапляла на лісты і кветкі. Расліны вельмі адчувальныя да дэфіцыту вільгаці ў перыяд бутанізацыі.

Размнажаюць і дзяленнем кораня. Дзяліць яго можна ў 3—4-гадовага дэльфініуму. Для гэтага вясной або ўвосень корань выкопваюць, разразаюць нажом паміж малады-мі парасткамі або пупышкамі. З аднаго кораня, у залежнасці ад яго памеру, можна атрымаць да 10 частак. Кожная частка павінна мець не менш як 1 парастак або пупышку і здаровыя карані. Высаджаныя ў кветнік такія расліны зацвітаюць у той жа год.

Гатунковыя дэльфініумы размнажаюцца пераважна дзяленнем кораня, а таксама насеннем. Трэба мець на ўвазе, што праз год насенне губляе ўсходжасць. Сяўбу праводзяць у сакавіку ў скрынкі і ставяць на акно. Усходы з'явяцца праз 20 дзён. Пасадку на пастаяннае месца праводзяць без пікіроўкі ў пачатку мая. Пры такой ранняй сяўбе расліны да канца лета набіраюцца сілы і зацвітаюць, утвараючы па адным невялікім суквецці на кожнай расліне. Саджаюць дэльфініум неглыбока, інакш расліна падгнівае. Сапраўднае цвіценне пачынаецца на другі год і можа быць двухразовым — у чэрвені і жніўні. У сухое надвор'е дэльфініум шчодра паліваюць, таму што ён вельмі пакутуе ад высокіх тэмператур і асабліва ад сухасці паветра. Кожнай расліне за вегетацыйны перыяд неабходна атрымаць каля 100 л вады.

Глебу вакол дэльфініума рыхляць на глыбіню не больш як 5 см, каб не пашкодзіць дробныя карані, якія разрастаюцца на вялікай адлегласці ад асновы куста. На працягу вегетацыйнага перыяду расліну некалькі разоў падкормліваюць: першы раз у красавіку, другі — у пачатку цвіцення.

Летам расліну абавязкова падвязваюць, таму што пры моцным ветры яна можа зламацца. Высаджваюць дэльфініумы ў розных кветніках, у тым ліку ў цэнтры клумбы і на газоне асобнымі групамі. Добра іх размяшчаць уздоўж агароджы.

Месца для расады

Як толькі з'яўляюцца ўсходы, са скрынак з расадай здымаюць плёнкі, шкло і іншыя ўкрыцці і выстаўляюць на самае светлае акно. Большасць агароднікаў вызначае месца для расады на падаконніку. Там, вядома ж, месца больш светлае, але... Неабходна забяспечыць раўнамерную тэмпературу 18—25 градусаў, старацца, каб не было скразнякоў з аконных рам і засцерагаць расліны ад патокаў цёплага паветра, якое выходзіць ад батарэй. Пакаёвыя расліны, якія знаходзяцца на падаконніку, трэба перанесці ў іншае месца, каб пазбегнуць пераносу шкоднікаў з іх на расаду.

Важнае значэнне для развіцця расады мае даўжыня светлавога дня. Святло аказвае вялікае ўздзеянне на развіццё каранёвай сістэмы: пры інтэнсіўным асвятленні яна развіваецца больш хутка, чым наземныя органы. Памятайце, што з інтэнсіўнасцю асвятлення трэба звязваць і тэмпературныя ўмовы. Калі святла паступае да раслін менш, то абавязкова трэба зніжаць і тэмпературу глебы і паветра. Інакш расада вельмі хутка выцягваецца. Таму ў пахмурныя дні і ў вячэрні час расаду трэба дадаткова падсвечваць электралямпамі.

Паліў і падкормка расады

Па меры падсыхання глебы расаду паліваюць. Каб вада не застойвалася ў скрынках з расадай, пры іх зборцы ў днішчы пакідаюць зазоры. Некаторыя гаспадары для паліву карыстаюцца сабранай дажджавой вадой, вадой ад талага снегу. Водаправодную ваду на працягу сутак адстойваюць і паліваюць цёплай вадой. Палівы праводзяць, калі глеба падсохне. Частае паліванне прыводзіць да вымывання пажыўных рэчываў з глебы і паражэнню расады чорнай ножкай альбо бурай гніллю каранёў. Калі пры высяванні расады выкарысталі пэўны грунт глебы, падкормку яе да пікіроўкі не праводзяць.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 667. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

10 лютага 2011 г. № 5 (243)

ДЫЯЛОГ УЛАДЫ І НАСЕЛЬНІЦТВА

Нараўлянскі раён знаходзіцца на самым поўдні Гомельшчыны. У сувязі з катастрофай на Чарнобыльскай атамнай станцыі тут перасталі існаваць 40 населеных пунктаў, што абумовіла скарачэнне насельніцтва больш чым удвая. Калі ў 1986 годзе ў рэгіёне пражывала крыху менш за 28 тысяч чалавек, то сёння — каля 11 тысяч, у тым ліку ў сельскай мясцовасці — усяго 3 тысячы.

— Прайшло амаль 25 гадоў з той пары, калі выбух на ЧАЭС накрыў сотні беларускіх вёсак, — расказала **старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў Ала НАВУМЕНКА**. — Наша задача — ва ўмовах радыеактыўнага забруджвання мясцовасці стварыць для насельніцтва максімальна бяспечныя ўмовы пражывання на гэтай тэрыторыі. У нас выконваюцца ўсе мінімальныя сацыяльныя стандарты, у тым ліку ў плане медыцынскага, гандлёвага, культурнага абслугоўвання, пастаянна даюцца тлумачэнні па бяспечным пражыванні на забруджанай тэрыторыі. Сістэма работы мясцовых органаў улады, у тым ліку і мясцовых Саветаў дэпутатаў, скіравана на паляпшэнне якасці жыцця людзей.

У Нараўлянскім раёне створаны інфармацыйна-прапагандысцкія групы, у склад якіх уваходзяць работнікі адукацыі, аховы здароўя, гандлю, сацыяльнага абслугоўвання, правапарадку, камунальнага абслугоўвання. І ў абавязковым парадку — дэпутаты. Штомесяц групы праводзяць сустрэчы ў працоўных калектывах і з насельніцтвам па месцы жыхарства.

Растлумачальнай працай дзейнасць інфармацыйна-прапагандысцкіх груп не заканчваецца. Свой працяг яна атрымала на сельскіх сходах і сходах грамадзян у мікрараёнах горада.

— У Нараўлянскім раёне ў сістэму работы мясцовых органаў улады ўвайшло абавязковае штомесячнае правядзенне сходаў у сельскіх населеных пунктах і мікрараёнах. Сходы праходзяць пры ўдзеле старшыні райвыканкама, яго намеснікаў, старшыні райсавета, а таксама старэйшын, вулічных і дамавых камітэтаў і дэпутатаў — як раённага, так і сельскіх Саветаў... У выніку ў нас атрымалася змясціць так званы «цэнтр цяжару» ў вырашэнні праблем на першасных узроўнях і гэтым узмацніць ролю сельскіх Саветаў. Іх старшыні сталі паўнапраўнымі гаспадарамі на сваёй тэрыторыі. Але яны не засталіся сам-насам са сваімі пытаннямі.

Для эфектыўнага супрацоўніцтва райсавета, райвыканкама і сельскіх Саветаў распараджэннем старшыні райвыканкама за сельскімі населенымі пунктамі былі замацаваны работнікі раённага выканаўчага камітэта, якія, як падкрэсліла Ала Навуменка, кожны дзень сумесна са старэйшынамі і старшынямі сельскіх Саветаў высвятляюць і вырашаюць праблемы тэрыторыі.

У раёне рэгулярна праводзяцца сумесныя прыёмы грамадзян членамі Савета Рэспублікі, дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў, Гомельскага абласнога Савета, Нараўлянскага раённага Савета і сельскіх Саветаў. Сістэма ўжо дае свае станоўчыя вынікі: у 2010 годзе колькасць зваротаў у вышэйстаячыя органы дзяржаўнага кіравання ў параўнанні з 2009-м скарацілася амаль удвая.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

КАМПЕТЭНТНА

«ПАЧЫНАЦЬ СВОЙ БІЗНЭС СКЛАДАНА ЎСЮДЫ — І Ў НАС, І Ў ГЕРМАНІІ, І Ў КАНАДЗЕ...»

Да мінулага года Сяргей НАВІЦКІ быў вядомы грамадскасці як генеральны дырэктар сумеснага беларуска-германскага прадпрыемства «Хенкель Баўтэхнік» і паспяховы бізнэсмен. Падчас апошніх выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў ён стаў дэпутатам Мінскага абласнога Савета, спалучыўшы гэтую «пасаду» яшчэ з адной — старшыні абласнога Савета па развіцці прадпрымальніцтва.

Нагод для інтэрв'ю, здаецца, больш чым дастаткова, аднак справа не толькі ў іх. Сяргей Рыгоравіч і сам чалавек незвычайны. Гэткі рухавік. Цэнтр зладжанай сістэмы, у якой кожны «вінцік» мае сваё месца і дакладна вызначаныя функцыі. Гаварыць з ім лёгка. Ён ведае і даходліва фармулюе нейкія складаныя рэчы, да якіх не так проста дайсці сваім розумам. І разам з тым можа шчыра здзіўляцца — напрыклад, таму, што нейкае дробязнае пытанне здольнае давесці людзей ледзь ці не да вайны, што чалавек траціць здароўе і гады жыцця на тое, каб адваяваць у суседа 30 сантыметраў зямлі ці прымусіць мясцовую ўладу прыбраць смецце ля сваёй агароджы. «Гэта не барацьба за прынцыпы, а бязглуздзіца нейкая. Калі ты змагаешся за чысціню — вазьмі і прыбяры каля сябе, паднімі пустую бутэльку ці паперку і выкінь у сметніцу. Я заўсёды так раблю, і шапка з мяне яшчэ не звалілася», — гаворыць мой візаві. Стаўленне да ўтрыманства, якое надзейна ўкаранілася ў нашым грамадстве, у спадара Навіцкага крайне адмоўнае. Па-першае, таму што яму самому ніколі не даводзілася жыць за чужы кошт. Па-другое, на ўтрыманстве не пабудуеш моцную, сапраўды незалежную краіну.

— Безумоўна, не ўсе могуць быць прадпрымальнікамі, ды гэта і не трэба, — кажа ён. — Галоўнае, адвучыць чалавека чакаць, што яму нехта нешта павінен даць. Людзі прывыклі, што за іх усё можа зрабіць дзяржава, улада. Такая, ведаеце, інертнасць у нас жыве яшчэ з савецкіх часоў.

Хоць, з іншага боку, радуюць і рэальныя праявы мясцовага самакіравання. На тэрыторыі Ждановіцкага і Папярнянскага сельсаветаў Мінскага раёна, якія я прадстаўляю як дэпутат, грамадзяне — уладальнікі жылых дамоў аб'ядноўваюцца ў суполкі «па інтарэсах» і разам вырашаюць, як уладкаваць сваё жыццё. Збіраюць сродкі (скажам, на будаўніцтва водаправода), узгадняюць гэтае пытанне з сельскім Саветам — і ўсё, праблема адпала. Адзінае, з чым дапамагае сельвыканкам, — гэта падрыхтоўка праектна-каштарыснай дакументацыі, паколькі зямля знаходзіцца ў яго веданні. У такім падыходзе ёсць два станоўчыя моманты: палёгка для дзяржавы і хуткае вырашэнне праблемы для грамадзян.

— Ці ёсць у вас, Сяргей Рыгоравіч, праграма-максімум, якую вы як дэпутат маеце намер выканаць?

— Мне ўвогуле цікава кантактаваць з людзьмі — па-за межамі ўсялякіх праграм, цікава слухаць, пра што яны гавораць, і па меры сваіх магчымасцяў дапамагаць — калі не матэрыяльна, дык хоць бы падказкай... Ну а мэты ў мяне канкрэтныя і ідуць яны ад жыцця. Мінскі раён, як вядома, вельмі бурна развіваецца, і за ім не паспяваюць ні інжынерна-камунікацыйныя сеткі, ні структуры сацыяльныя. Пасёлкі Ждановічы, Ратамка — гэта практычна цэлыя гарады. У тых жа Ждановічах неабходна пабудаваць або нармальную паліклініку, або пашыраны фельчарска-акушэрскі пункт, і абавязкова пашырыць школу, таму што месцаў там ужо недастаткова. Людзі вымушаны вазіць дзяцей на вучобу ў Мінск, пры гэтым перагружаючы прыгарадны транспарт — аўтобусы, маршруткі, якіх таксама не хапае. Па меры магчымасцяў і ў межах сваёй кампетэнцыі паспрабую дапамагчы сваім выбаршчыкам.

— А калі мець на ўвазе сферу вашых прафесійных інтарэсаў — тут нейкія пазіцыі будзеце адстойваць? Ці можна сказаць, што сёння ў Беларусі ствараюцца максімальна спрыяльныя ўмовы для развіцця прадпрымальніцтва?

— Як дэпутат, я магу аказваць тут пэўны ўплыў, выносіць прапановы па змяненні заканадаўства, якое датычыцца бізнэсу. І не толькі як дэпутат, а яшчэ і як старшыня абласнога Савета па развіцці прадпрымальніцтва. Збіраемся мы раз у два месяцы на чале са старшынёй Мінскага аблвыканкама Барысам Батурам, але праца ідзе штодзённая. Яна «выліваецца» ў канкрэтныя прапановы для органаў улады абласнога і больш высокіх узроўняў. Шматлікія пытанні, якія ўзнімалі прадпрымальнікі, былі вынесены на разгляд IV Усебеларускага сходу. Дарэчы, усе яны адлюстраваныя і ў Дырэктыве Прэзідэнта № 4 аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы... Ці задавальняе яна сёння ўсе нашы патрэбы? Ну, можаў для дасканаласці няма. Пакуль што гэта толькі дэкларацыя, дзе прапісаныя ясныя і дакладныя накірункі, у адпаведнасці з якімі павінна рухацца краіна. Але калі ўсё, што ў ёй выкладзена, будзе рэалізавана ў выглядзе заканадаўчых, нарматыўна-прававых актаў, па якіх пачне жыць прадпрымальніцтва, дык лепшага і жадаць не трэба. Ва ўсялякім разе, пакуль што.

— Вашага прадпрыемства дырэктыва таксама датычыцца?

— Самым непасрэдным чынам. І нас, і іншых прадпрыемстваў. Паколькі дзякуючы гэтаму дакументу плануецца зняць шэраг абмежаванняў па фарміраванні цэн на прадукцыю, заработнай платы, па найме работнікаў... Свабоднае цэнаўтварэнне — гэта ўвогуле ключавое пытанне рыначнага прынцыпу вядзення бізнэсу. Дзяржаўнае рэгуляванне цэн застанецца толькі ў дачыненні да сацыяльна значных тавараў — скажам, малака, хлеба ці лекаў. Гэта правільны падыход, практычна ўвесь свет так жыве. Другі момант — фарміраванне заработнай платы. Нам у гэтым плане больш пашанцавала: для замежных і сумесных прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі, якім з'яўляецца «Хенкель Баўтэхнік», асаблівых абмежаванняў пры фарміраванні заработнай платы, «прывязак» да стаўкі першага разраду не было і раней. Але для іншых прадпрымальнікаў — а такіх большасць — існавалі і тарыфныя сеткі, і штатныя расклады. Іх эканамісты сядзелі і ўсё гэта падлічвалі, рабілі абсалютна непрадукцыйную працу, якая не мела дачынення да развіцця вытворчасці...

Зразумела, што ўладальнік бізнэсу сам павінен вырашаць, якую зарплату плаціць наёмнаму работніку — хоць 10 мільёнаў, хоць 100, калі якасць працы яго задавальняе. І ўсё, і не трэба нічога вылічваць і «прывязваць».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

На людское казанне — дзяржаўнае выкананне

Новаму ўраду ў бягучай пяцігодцы давядзецца змагацца не толькі і не столькі за эканамічныя паказчыкі, колькі за прыхільнасць народа

У пагоні за ростам валавога ўнутранага прадукту ды станоўчым сальда знешняга гандлю варта не забыцца на патрэбы простых людзей. Тэзіс «дзяржава для народа», паводле слоў кіраўніка краіны, павінен стаць рэальным у жыцці кожнага беларуса.



Стварэнне камфортных умоў для жыццядзейнасці людзей абвяшчаецца найвышэйшай мэтай. А ўсё глабальнае пачынаецца, як заведзена, з малага. У нашым выпадку — са стварэння камфорту ў кожным канкрэтным мястэчку. У Клецку, напрыклад, ці ў Нясвіжы. Абмяркуем гэта з Аленай НОВІК, якую тамтэйшыя жыхары дэлегавалі сваім дэпутатам у Палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу.

— Работа ў акрузе — важны кірунак для дэпутата, які патрабуе вельмі адказнага стаўлення. Каб праблемы людзей вырашаліся як мага хутчэй, без валакіты. Шчырасці ад нас вымагае, неабыякавасці — фармалізм тут не пройдзе. Непрадузятасць таксама мае вырашальнае значэнне: мы ж усім дапамагаем, незалежна ад статусу і звання. І яшчэ адзін істотны момант. Каб палегчыць жыццё сваім выбаршчыкам, дэпутату неабходна мець сувязь і з імі, і з рознымі прадстаўнікамі ўлады — сумесна лягчэй вырашаць пытанні, прадстаўляць інтарэсы землякоў на рэспубліканскім узроўні.

— Ну і як, знаходзіце агульную мову з тымі і другімі?

— Без лішняй сціпласці магу сказаць, што ў нас гэтыя сувязі наладжаны надзвычай добра. І ў многім дзякуючы адзінаму дню дэпутата. На Міншчыне такая форма работы стала ўжо традыцыяй. Мы сустракаемся штомесяц: народныя выбраннікі ўсіх узроўняў (дэпутаты мясцовых Саветаў, члены абедзвюх палат парламента), кіраўнікі арганізацый і ўстаноў, якія знаходзяцца на тэрыторыі гэтага сельсавета, і мясцовыя жыхары, зразумела. Тэма для сустрэчы бярэцца не са столі — плануецца загадзя, зыходзячы з патрэб грамадзян, на падставе аналізу іх зваротаў. Калі сёння больш пытанняў выклікае ў жыхароў, скажам, добраўпарадкаванне тэрыторый, то, натуральна, менавіта гэта мы будзем абмяркоўваць. Сустрэчы праходзяць адкрыта, з удзелам усіх зацікаўленых. Кожны можа выказацца за і супраць. Ідзе жывая гутарка, мы шмат спрачаемся. Зразумела, зараз заасфальтаваць ўсе дарогі і ў Клецку, і ў Нясвіжы немагчыма, хоць кожнаму гараджаніну і хочацца, каб так было. Але ёсць графік, і мы пра яго расказваем, абгрунтоўваем, чаму павінна быць так, а не іначай. Гэтым не заканчваецца дзень дэпутата. Мы абавязкова сустракаемся з жыхарамі аддаленых вёсак для таго, каб ведаць і іх праблемы. Глядзім, як яны вырашаюцца, якія яшчэ захады трэба зрабіць. Увогуле, адзіны дэпутацкі дзень — практыка вельмі карысная. І для нас, і для выбаршчыкаў. Мы, пачуўшы пра іх праблемы, становімся да іх бліжэй. Яны, выказваючы асабістыя просьбы, даючы парады пры абмеркаванні пытанняў дзяржаўнай значнасці, па сутнасці, бяруць удзел у кіраванні краінай. Усе важныя рашэнні сапраўды прымаюцца з улікам іх пазіцыі. Безумоўна, гэта на карысць простаму чалавеку. Натуральна, не грэбую я такімі звыклымі формамі работы з выбаршчыкамі, як асабістыя прыём, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы на прадпрыемствах, у арганізацыях, установах.

— Якія сігналы ад іх атрымліваеце?

— Ведаеце, маіх выбаршчыкаў турбуе тое ж, што і іншых людзей па ўсёй краіне. Паляпшэнне жыллёвых умоў і паслугі ЖКГ — гэтыя дзве сферы застаюцца для насельніцтва самымі праблемнымі. І гэта можна зразумець. Справа не толькі ў сезоннасці. Хоць узімку заўжды хапае турбот з ацяпленнем... Шмат нараканняў апошнім часам выклікае якасць узведзеных жылых дамоў. Рамонт жылля, будаўніцтва водаправодаў, газіфікацыя — усе гэтыя пытанні круглы год на парадку дня. Можа, гэта яшчэ і з-за таго, што сама па сабе жыллёва-камунальная сфера вельмі вялізная. У гандлі вось што самае галоўнае для пакупніка? Асартымент тавараў і якасць абслугоўвання. А калі ўзяць ЖКГ, то пералік такіх пытанняў будзе значна шырэй.

— Але ж пэўная мясцовая спецыфіка, відаць, усё ж ёсць? Нясвіж — сапраўдная турыстычная Мекка, але там да нядаўняга часу нават пераначаваць не было дзе. Якія-небудзь зрухі ўжо адбыліся?

— Так, спадчына тут сапраўды багатая. Улетку павінна прыйсці да завяршэння рэканструкцыя замка. У шэрагу пакояў экскурсіі праходзяць ужо сёння. Гасцініцы насамрэч былі вялікай праблемай у Нясвіжы. Менавіта былі, таму што цяпер, мяркую, гэта пытанне ўжо амаль знятае. У гістарычнай частцы горада прадпрыемствам «Культурная спадчына» пачата будаўніцтва гасцініцы на 60 нумароў. Праводзяцца работы па рэканструкцыі гасцініцы РУП «Нясвіжская ЖКГ». Там надбудуюць чацвёрты паверх, усталююць ліфт і змогуць прымаць 87 наведнікаў. На тэрыторыі самога замка ў хуткім часе адкрыецца гасцініца на 49 месцаў. Думаю, гэтага хопіць для размяшчэння ўсіх ахвотнікаў.

— А кавярні, крамы, іншыя аб'екты турыстычнай інфраструктуры?..

— Згодная, яны таксама важныя. І пытанне варта вырашаць не толькі для турыстаў, але і для саміх жыхароў Нясвіжа. І гэта ўжо хутчэй поле дзейнасці для прыватнікаў. Уцешна, што бізнэс у абодвух раёнах маёй акругі развіваецца. Многія папулярныя ў жыхароў Клецка і Нясвіжа аб'екты належаць менавіта прыватнікам. Напрыклад, крамы «Алёнка», «Рэбус-Плюс», «Белгандальстыль», «Асарці». Рынак ажывае, варушыцца пачынаюць і дзяржаўныя структуры — даводзіцца канкураваць. У Клецку літаральна нядаўна пачаў работу ўніверсам «Цэнтральны», дзе ўстаноўлена сучаснае гандлёвае абсталяванне, усе аперацыі камп'ютарызаваныя. З улікам рэкамендацый упраўлення аховы помнікаў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь прадпрыемству «Экатрэйд» заказаны выраб праектна-каштарыснай дакументацыі на будаўніцтва рэстаранна-гасцінічнага комплексу ў Нясвіжы. У хуткім часе адкрыюць свае фірменныя крамы з міні-кавярнямі «Клецкая крыначка» і «Клецкі вытворча-харчовы завод». А выйграе ад усяго гэтага найперш спажывец. Таму дзяржава і пачынае выбудоўваць прынцыпова новы дыялог з прадпрымальнікамі, пра што сведчыць з'яўленне Дырэктывы № 4. Канкрэтна ў маёй акрузе шмат робіцца для разняволення прадпрымальніцкай ініцыятывы. Рэгулярна праводзяцца сустрэчы з прадстаўнікамі малога і сярэдняга бізнэсу. Многія пытанні, з якімі яны звяртаюцца да мясцовай улады, вырашаюцца.

— Якую заканадаўчую «наводку» даюць вам уласныя выбаршчыкі?

— Наўскідку магу прыгадаць слушную ідэю маёй выбаршчыцы наконт Жыллёвага кодэкса. Яна прапануе, каб уласнік жылля меў вырашальнае права голасу. Што маецца на ўвазе? Сёння, каб прапісаць некага ў сваю кватэру, ёй патрэбна згода ўсіх, хто там жыве. А калі гэта былыя сваякі, якія, на жаль, часта становяцца люстымі ворагамі, гэта практычна нерэальна. Яна задаецца пытаннем: калі чалавек не зрабіў ніякага ўнёску ў набыццё кватэры, чаму ён павінен вырашаць за ўладальніка, каго яму прапісваць, а каго не прапісваць у сваю кватэру? І, я лічу, мае рацыю. Трэба павышаць самастойнасць уладальніка, умацоўваць яго права распараджацца ўласнасцю. Гэта ж яго кроўна зароблена, яму і гаспадарыць!

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

МЯСЦОВЫ ЧАС

ЗАМЕСТ РАЙЦЭНТРА — АГРАГАРАДКІ

Статыстыка — рэч дакладная, і ўсё ж калі-нікалі неабходна рабіць пэўныя агаворкі. Афіцыйна насельніцтва Магілёўскага раёна складае амаль 45 тысяч чалавек. Гэта ўзімку. Летам колькасць жыхароў узрастае ці не ўдвая. Прычым, шматлікія дачнікі з'яўляюцца далёка не адзінай асаблівасцю «прыгараднага» рэгіёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прыватнік супраць беспрацоўя

Працяглы час Магілёўскі раён мае па-сапраўднаму нізкі ўзровень беспрацоўя: у пачатку года гэты паказчык складаў 0,6 працэнта ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. На ўліку ў службе занятасці знаходзіліся крыху больш за сто чалавек. І падобны малюнак не выпадковы. Традыцыйны варыянт працаўладкавання мясцовых жыхароў — Магілёў. У дадатак, зрабілі сваю справу падатковыя льготы, невялікая адлегласць ад абласнога цэнтра, буйныя аўтатрасы і чыгунка. У раёне працуе 1611 самых розных недзяржаўных суб'ектаў гаспадарання, і накірункі іх дзейнасці не абмяжоўваюцца «стандартным» гандлем — на тэрыторыі рэгіёна існуюць буйныя вытворчасці арматурных труб, нятканага палатна, газасілікатных вырабаў. У выніку менавіта недзяржаўны сектар дае значную частку працоўных месцаў.

— У нас ёсць па-сапраўднаму моцныя сельгаспрадпрыемствы, але для мясцовага бюджэту галоўныя не яны, — распавядае **старшыня Магілёўскага райсавета Валянцін САЛАВЕЙ**. — 52 працэнты паступленняў прыносіць менавіта недзяржаўная сфера. Яна ж забяспечвае і большыя ў параўнанні з АПК заробкі — 1,5-2 мільёны рублёў. Адпаведна, сюды ідуць людзі. Разам з тым казаць, што сельгаскааператывы адчуваюць востры «кадравы голад», таксама нельга. Аб'явы кшталту «патрабуецца механізатар» сустракаюцца ўсё радзей. Бо ў вёсцы з'яўляецца сучасная магутная тэхніка. Тое, што раней рабілі пяць трактароў, цяпер робіць адзін.

Між тым, акрамя адсутнасці вялікіх праблем з занятасцю, бясспрэчнай перавагай прыгараднай зоны з'яўляецца зямля. Попыт на яе сярод гараджан, якія хочуць мець у прыгарадзе дачу ці індывідуальны дом для пражывання, значны. А гэта ўплывае на цэны. Паблізу ад абласнога цэнтра ўчастак у 15 сотак ідзе з аўкцыёну недзе за 15—20 мільёнаў, па-сапраўднаму ж рэкорднай тут стала сума ў 140 мільёнаў рублёў. І гэта — дадатковыя магчымасці. Скажам, у сувязі з перадачай сельскіх дарог на баланс жыллёва-камунальнай гаспадаркі і дарожнай службы толькі сельсаветы ўклалі ў іх рамонт 1 мільярд 765 мільёнаў — грошы, пра якія ў іншых рэгіёнах толькі мараць.

— Аднак я не кажу, што ніякіх праблем няма — наадварот, іх шмат, — працягвае Валянцін Салавей. — У людзей узнікае шэраг пытанняў па камунальным абслугоўванні, рамонце жылля і забеспячэнні вадой — асабліва ў вёсках, дзе няма водаправода і дзе карыстаюцца калодзежамі 30—40 гадовага «ўзросту». Востры момант — газіфікацыя. Пасля змянення ўмоў аплаты для грамадзян інтарэс тут вялікі, створана каля трох дзясяткаў кааператываў, распрацавана дакументацыя на агульную суму 3,9 мільярда рублёў. А сродкаў у раёне не хапае. Такім чынам, утварылася чарга.

Сродкі ад міграцыі

Зняць некаторыя пытанні дапамагае суседства з Магілёвам. Дзякуючы настаўнікам з абласнога цэнтра ў раёне амаль няма цяжкасцяў з кадрамі ў школах. Асобная гаворка пра медыцыну. Яна ўвогуле перададзена ў веданне гораду. Сітуацыя аказалася неадназначнай. З аднаго боку, жыхары вёскі атрымалі «прамы доступ» да больш сучаснага абсталявання і высокакваліфікаваных спецыялістаў. Але з іншага, раз-пораз узнікаюць цікавыя сітуацыі: у раёне разумеюць, што было б някепска дапамагчы пэўнаму ФАПу. Але, па сутнасці, гэты ФАП знаходзіцца за межамі іх «кампетэнцыі», бо падпарадкаваны гораду.

— Галоўная наша асаблівасць — адсутнасць уласнага райцэнтра, — адзначае Валянцін Салавей. — Так, можна сказаць, што ўся неабходная інфраструктура ёсць у Магілёве, аднак падобнае меркаванне — шлях да паскарэння міграцыі ў горад. Таму мы робім стаўку на аргагарадкі. Цяпер у іх жыве амаль кожны другі жыхар раёна, і гэтыя людзі павінны мець усю патрэбную інфраструктуру, у тым ліку лазні і спартыўныя аб'екты. У дадатак, у аграгарадках актыўна будуецца жыллё. Зразумела, што да 80 працэнтаў жыхароў некаторых жыллёвых кааператываў будуць працаваць у абласным цэнтры. Але многія пачнуць шукаць сабе працоўнае месца побач з домам. Таму дзяліць людзей на «сваіх» і «чужых» нельга, у рэшце рэшт усе яны — нашы.

Гульня без правілаў?

Аднак суседства з буйным горадам мае не толькі перавагі. Адзін з «мінусаў» — так званая сезонная злачыннасць. На тэрыторыі раёна налічваецца 177 садаводчых таварыстваў, прычым, «жылымі» яны з'яўляюцца толькі з мая па кастрычнік. У іншы час дамы стаяць пустыя і прыцягваюць няпрошаных гасцей — як правіла, з Магілёва. Звычайна справа абмяжоўваецца крадзяжамі бытавой тэхнікі, агародніны ці бульбы.

Не менш востры момант — смецце. Калі з пастаяннымі жыхарамі раёна асаблівых цяжкасцяў няма, то аб гараджанах-дачніках такога сказаць нельга. Апошнім часам садаводчыя таварыствы актыўна заключаюць дагаворы з камунальнікамі на вываз адходаў. Аднак змяніць менталітэт складана, як і спакусу цішком выкінуць смецце на ўзбочыне дарогі ці ў лесе.

— Меры ўздзеяння тут вядомыя — папярэджанні і штрафы, прычым паступова яны сапраўды даюць вынік, — заўважае Валянцін Салавей. — Аднак існуе і праблема — адсутнічаюць правілы ўтрымання населеных пунктаў. Спроба распрацаваць іх самастойна выніку не прынесла, нашы прапановы проста не прайшлі экспертызу, таму стала відавочным, што падобныя правілы павінны быць прынятыя на ўзроўні дзяржавы. Бо зразумела: у адваротным выпадку вельмі цяжка прад'яўляць канкрэтныя патрабаванні і, адпаведна, складана весці гаворку аб навядзенні належнага парадку.

Сяргей ГРЫБ.

Магілёўскі раён.

«ПАЧЫНАЦЬ СВОЙ БІЗНЭС СКЛАДАНА ЎСЮДЫ — І Ў НАС, І Ў ГЕРМАНІІ, І Ў КАНАДЗЕ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Што, на ваш погляд, перашкаджае развіццю прадпрымальніцкай дзейнасці?

— Падатковае заканадаўства ў нас самае грувасткае ў свеце. У адпаведнасці з апытаннем, якое праводзіў Сусветны банк у 2010 годзе, па зручнасці сістэмы падаткаабкладання мы знаходзімся амаль што на апошнім месцы са 184 краін... Чалавек баіцца пачынаць бізнэс, думае: а раптам я памылюся, зраблю нешта не так? І калі сапраўды памыляецца, яго могуць аштрафаваць на такую суму, што і бізнэсу таго не захочаш...

Неабходна спрашчаць і доступ да фінансавых рэсурсаў. Напрыклад, нехта захацеў заняцца вытворчасцю рыдлёвак ці сякер. Але яму патрэбны для гэтага станок. Ён прыходзіць у банк па крэдыт, а банк гаворыць: пакінь нам залог... А што яму пакідаць?.. У любым выпадку, гэта складана. Таму на ўзроўні дзяржавы павінна, на мой погляд, існаваць структура, якая займалася б падтрымкай так званага «мікрабізнэсу», магла б забяспечваць пэўныя гарантыі са свайго боку... Такія гарантыі маглі б даваць і мясцовыя органы ўлады. Не ўсім запар, зразумела. Але тым, каго ведаюць, людзям са станоўчай дзелавой рэпутацыяй — дакладна маглі б. Прыйшоў, скажам, у сельвыканкам Іван Сідараў і сказаў: «Хачу вырошчваць кветкі, але мне не хапае сродкаў». Ну і няхай старшыня гэтага сельвыканкама, як дзяржаўная асоба, падтрымае яго, возьме на сябе пэўную долю рызыкі!..

> ***«Уладальнік бізнэсу сам павінен вырашаць, якую зарплату плаціць наёмнаму работніку — хоць 10 мільёнаў, хоць 100, калі якасць працы яго задавальняе.***

— Але для гэтага ў сельвыканкаме таксама павінны быць сродкі. А іх практычна няма.

— Згодны, няма. Таму адна з галоўных мэт маёй дэпутацкай дзейнасці — дабівацца, каб больш сродкаў заставалася менавіта на ўзроўні сельсаветаў, каб мясцовая ўлада магла вырашаць свае задачы больш свабодна і аператыўна.

— Хто ж будзе пакрываць рызыку ў выніку банкруцтва «малога» прадпрымальніка?

— У першую чаргу сам прадпрымальнік і часткова дзяржава. А што рабіць? У Фінляндыі, напрыклад, для гэтых мэт створана цэлая дзяржаўная структура, дакладней, прадпрыемства, якое функцыянуе на ўзроўні міністэрства. Там усе правілы дакладна прапісаныя. Яно можа прагарантаваць і 20 працэнтаў рызыкі, і 30, і 50 — у залежнасці ад таго, чым патэнцыяльны прадпрымальнік будзе займацца... Калі жыхар Віцебскай вобласці раптам захоча вырошчваць на беразе возера бананы ці ківі — і я, і вы зразумеем, што праект недзеяздольны, і ў такім выпадку навошта нам браць на сябе рызыку? А вось стварэнне на беразе таго ж возера турыстычнай базы ці рэкрыяцыйнага цэнтра — гэта рэальна. Тады чалавеку неабходна дапамагчы, выступіць гарантам. Натуральна, пад распрацаваны бізнэс-праект.

Дзяржава ў свой час падтрымала сельскую гаспадарку — і вынікі не прымусілі сябе чакаць. Не ўсе працуюць аднолькава, але ёсць сельгаспрадпрыемствы, якія ператварыліся ў магутных вытворцаў сельгаспрадукцыі. Так і з прадпрымальніцтвам. Нехта патоне, абанкруціцца, а нехта стане на ногі. І апошніх, паверце, будзе значна больш.

— Вы пачыналі свой бізнэс таксама з малога прадпрыемства, з 23 чалавек...

— Не зусім. Спачатку я быў адзін, потым нас стала двое... Сёння ў нас працуе 150 чалавек.

— Якія якасці, на ваш погляд, неабходны для паспяховага вядзення бізнэсу? Бо пачынаюць многія, але да фінішу, да запаветнага сподачка з блакітным беражком, даходзяць не ўсе.

— Ну, па-першае, усе людзі розныя. Некаму, як гаворыцца, дадзена, іншаму — не. Акрамя гэтага, патэнцыяльны прадпрымальнік павінен быць актыўным, працаздольным, фізічна моцным і стрэсаўстойлівым. Без апошняга ўвогуле немагчыма.

— А што стымулюе чалавека ісці ў прыватныя прадпрымальнікі?

— Стымулы могуць быць усялякімі: наяўнасць сям'і, якую трэба забяспечваць, мары аб вялікіх заробках, імкненне да ўлады... Але галоўнае, на мой погляд, — гэта жаданне быць незалежным. А незалежнасць каштуе дорага, як для прадпрымальніка, так і для дзяржавы... Савецкая ўлада — добрая ці дрэнная — у свой час «прыціснула» ў людзях прадпрымальніцкую жылку. А цяпер стаіць супрацьлеглая задача — гэтых прадпрымальнікаў, гаспадароў, «кулакоў» — няважна, як яны будуць звацца, — рэанімаваць, адрадзіць. Яны будуць на сваёй зямлі, на сваіх прадпрыемствах адкрываць працоўныя месцы, стваралі дабаўленую вартасць і выплачваць дзяржаве падаткі.

А наконт таго, што не ва ўсіх атрымліваецца... Паводле аднаго з даследаванняў, у ЗША, самай перадавой з пункту гледжання свабоднага рынку краіне, ніводзін з самых паспяховых бізнэсменаў не абышоў працэдуры банкруцтва. Штогод там рэгіструецца каля 300 тысяч прадпрыемстваў і столькі ж банкруціцца. Прадпрымальніцтва заўсёды звязана з рызыкай, пачынаць бізнэс складана ўсюды — што ў нас, што ў Канадзе, што ў Германіі. Ніколі прадпрымальнікам не было і не будзе лёгка, бо ім заўсёды чагосьці не хапае.

Хочаш займацца прадпрымальніцтвам у Беларусі — займайся і не енчы, што цяжка. Калі ёсць цяжкасці — значыць, ёсць і «лёгкасці». Можа, ў нас заканадаўства не вельмі дасканалае, затое канкурэнцыі няма. У тых жа Злучаных Штатах заканадаўства адточвалася стагоддзямі. Але ж там канкурэнцыя! А тут свабодна. Прастор для дзейнасці, для фантазіі, для ўкладання сродкаў... Скажам, у той жа Чэхіі ў кожнай вёсачцы абавязкова ёсць дом, які называецца «піўніца» (па-нашаму «піўнуха»). Яна знаходзіцца на першым паверсе, а гаспадар з сям'ёй жыве на другім. Народ з працы прыходзіць, збіраецца там, культурна адпачываюць, знімаюць стрэс... У нас, калі табе выдзелілі ўчастак пад будаўніцтва жылля, ніякай вытворчасці ў гэтым доме ўжо не створыш — нельга. А чаму, уласна кажучы? Не развалілася ж ад гэтага Чэхія! Так што ёсць куды нам развівацца.

— Як лічыце, Сяргей Рыгоравіч, ці ёсць у Беларусі сярэдні клас?

— Ён ёсць хутчэй у сталіцы. На перыферыі, у глыбінцы людзі больш сціпла жывуць. У маленькіх населеных пунктах зарабляюць менш. І гэта лішні раз пацвярджае, што малы бізнэс неабходна развіваць менавіта там. Калі ён прыжывецца і запрацуе на месцах, людзі не захочуць з'язджаць адтуль у вялікія гарады.

Наталля КАРПЕНКА.

Мінск—Заслаўе.

На людское казанне — дзяржаўнае выкананне

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Само жыццё наводзіць на думку, што закон аб шлюбе і сям'і варта карэктаваць. Шмат пытанняў выклікае сёння сам інстытут сям'і. Ёсць шмат выпадкаў, калі жанчыны атрымліваюць ад дзяржавы дадатковую дапамогу як маці-адзіночкі, а ў саміх ёсць сужыцелі — так званы грамадзянскі шлюб. Здавалася б, на заканадаўчым узроўні іх адносіны не аформленыя, і сям'ёй гэта не назавеш. Аднак і маці-адзіночкамі такія жанчыны не з'яўляюцца. Я лічу, гэта несправядліва — усе павінны знаходзіцца ў роўных умовах.

Пытанні ўзнікаюць і наконт харчавання ў дзіцячых садках. Колькі бялкоў, тлушчаў і вугляводаў павінна быць у рацыёне дзіцяці, нібыта прапісана. Аднак вызначанай сумы не хапае для паўнавартаснага харчавання. Хочацца, каб нарэшце натуральныя і грашовыя нормы для яго прыйшлі ў адпаведнасць.

— А ў сістэме адукацыі якіх удасканаленняў нестае — вам як педагогу са стажам і дэпутату профільнай камісіі ідэй, відаць, не займаць?

— Як педагог, я перакананая, што на першым плане павінна стаяць якасць адукацыі. А яна забяспечваецца трыма складальнікамі: працай сапраўднага настаўніка-прафесіянала, належным матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем установаў адукацыі і... жаданнем вучня. Без апошняга моманту першыя два дарэмныя. А гэта ўжо нюансы выхавання. І, у прынцыпе, выхаваўчы працэс ва ўстановах навучання — якраз тое, што сёння цікавіць людзей, спецыялістаў і абывацеляў. У Кодэксе аб адукацыі гэтыя моманты знаходзяць адлюстраванне. Яго праект я, дарэчы, перадала для азнаямлення сваім калегам у акрузе (гэта звыклая практыка — абмяркоўваць законапраекты ў калектывах). Будзем удасканальваць яго супольна. Мяне асабліва турбуюць пытанні пенсійнага прафесійнага страхавання. Каб атрымаць ільготную пенсію, настаўнік павінен выканаць тры ўмовы. Мець пэўную нагрузку, займацца арганізацыйна-выхаваўчай дзейнасцю і дадатковым кантролем за навучальнай дзейнасцю. Трэцяя ўмова — няпэўная для некаторых катэгорый супрацоўнікаў. Напрыклад, для майстроў вытворчага навучання сельскагаспадарчых прафесійных ліцэяў. Мы ў профільнай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе настойваем, каб умова была толькі адна — 18 гадзін нагрузкі. І каб адпрацаваўшы так больш за 25 гадоў, настаўнік змог выйсці на пенсію ў 50.

Якімі б рознымі ні былі запыты выбаршчыкаў, усе жадаюць аднаго: каб жыццё станавілася больш камфортным. Сваё слова яны сказалі, справа — за тымі, хто дэлегаваны ва ўладу.

Зоя ВАРАНЦОВА.

ДЫЯЛОГ УЛАДЫ І НАСЕЛЬНІЦТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Для таго, каб захаваць народныя звычаі, традыцыі, арганізаваць культурны адпачынак людзей і заахвоціць іх да здаровага ладу жыцця, на тэрыторыі кожнага сельсавета раёна раз у квартал ладзіцца конкурс-агляд мастацкай самадзейнасці і спартакіяда па розных відах спорту, у якіх задзейнічаны ўсе працоўныя калектывы арганізацый і ўстаноў, размешчаных на тэрыторыі канкрэтнага сельсавета.

Зразумела, што для паляпшэння якасці жыцця людзей недастаткова арганізаваць іх адпачынак. У першую чаргу чалавек павінен мець працоўнае месца і магчымасць зарабляць грошы. Як патлумачыла Ала Навуменка, сітуацыя ўскладняецца яшчэ і з-за таго, што тэрыторыя, якая пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, не зусім прывабная для інвестараў. Тым не менш, дзякуючы прынятым нарматыўна-прававым актам, якія прадугледжваюць стварэнне спрыяльных умоў для развіцця бізнэсу ў сельскай мясцовасці, малых і сярэдніх гарадах, а таксама для работы мясцовых органаў улады, у Нараўлянскім раёне з'явілася 55 прадпрыемстваў прыватнай формы ўласнасці, у тым ліку 9 — у вёсках. У 2010 годзе створана 199 працоўных месцаў, з іх звыш 50 — у вёсках.

Адным з асноўных кірункаў дзейнасці дэпутатаў у раёне з'яўляецца работа з органамі грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання, якія аб'ядноўваюць 366 чалавек. Для каардынавання іх дзейнасці створаны Савет грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання, практыкуюцца штоквартальныя семінары-нарады з удзелам прадстаўнікоў выканаўчай улады і органаў грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання. У выніку атрымліваецца адкрыты дыялог улады і насельніцтва.

Ала Навуменка падкрэсліла, што дзякуючы зацверджанай кіраўніком краіны Дзяржаўнай праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця і комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся на 2010—2015 гады Нараўлянскі раён атрымае другое дыханне. У мінулым годзе ў сувязі з рэалізацыяй праграмы ў Нараўлянскім раёне ўжо было асвоена 9,5 млрд рублёў. У 2011-м плануецца асвоіць больш за 60 млрд, а ў цэлым на яе рэалізацыю прадугледжана каля 250 млрд рублёў.

— Праграма скіравана на паляпшэнне якасных параметраў жыцця людзей, а таксама на рацыянальнае выкарыстанне прыроднага патэнцыялу ракі Прыпяць. Мы спадзяёмся, што гэта пацягне за сабой і развіццё турызму. Хацелася б не разглядаць свой рэгіён як пацярпелы, а інтэнсіўна развіваць яго, — падсумавала старшыня райсавета.

Інга МІНДАЛЁВА.

Гаспадыня вёскі

У вёскі Чамеры Азгіновіцкага сельсавета, што на Слонімшчыне, свае асаблівасці. І не толькі таму, што карані яе ідуць у далёкае 14-е стагоддзе. Працягнуцца б Чамерам нітачкай — дык не, раскінулася сямю вуліцамі, як кажуць, па далінах ды па ўзгорках. У гарадскую рысу трапілі. Ды яшчэ некалькі дачных кааператываў тутэйшая мясцовасць прыцягнула.

— Чым больш асаблівасцяў, тым больш праблем даводзіцца вырашаць селькаму, — гаворыць старшыня мясцовага сельскага камітэта Марыя Чыгрын. — Паколькі вёска размешчана ў прыгарадзе і амаль усе яе жыхары працуюць у Слоніме, узнікла неабходнасць у рэйсавым аўтобусе. Я абышла прадпрыемствы, школы, пабывала на прыёме ў старшыні райвыканкама, у аўтобусным парку... У выніку аўтобус № 4 стаў рабіць 12 рэйсаў на дзень. Але людзі ёсць людзі. Аднаму гэты рэйс не падабаецца, іншаму — той... Цяпер рэйсаў стала менш — і ўсіх задавальняе. У міжсезонне, калі зменшылася колькасць пасажыраў-дачнікаў, з рэйса знялі кандуктара. Пакуль вадзіцель усіх абілеціць — людзі спазняюцца на працу. Зноў паехала да інжынера па перавозках пасажыраў. Пабяцалі вырашыць пытанне станоўча. Калі б яшчэ людзі з пытаннямі ў сельвыканкам званілі, дык не — прама на дом...

— Дык гэта вялікі давер вам, Марыя Сцяпанаўна, — падхоплівае размову старшыня сельскага Савета Мікалай Крамнік.

Марыя Сцяпанаўна і не пярэчыць:

— Ведаючы занятасць Мікалая Мікалаевіча, стараюся яго па дробязях не турбаваць, — гаворыць яна. — Вось патэлефаную неяк чалавек, паведаміў, што збіты люк на калодзежы па вуліцы Замкавай. Пайшла, паглядзела сама, пазваніла ў «Водаканал». Прыехалі — зачынілі.

Апытала ўсіх жыхароў нашай вуліцы наконт перспектывы падводу вады ў дамы. Толькі трое выказаліся «за». Астатніх калодзежы ў дварах задавальняюць. Вада ў нас добрая, зноў-такі можна помпу ўстанавіць, бойлер набыць. Некаторыя, і я ў тым ліку, гэта і зрабілі: калі трэба — вада гарачая і халодная прама ў доме. І газ на нашай вуліцы ёсць — таксама давялося патурбавацца.

Часам прыходзіцца ёй нават выступаць трацейскім суддзёй у сямейных або суседскіх канфліктах — чаго ў жыцці не здараецца! У вёсцы, дзе пражывае больш за 400 чалавек, усё больш прыезджых. Бывае, адзін і той жа дом за пяць гадоў некалькі разоў перакупляюць. А прыезджыя — гэта не карэнныя жыхары. Сустракаюцца такія, што палец аб палец не ўдараць дзеля агульнай справы, ім гатовае падавай...

Але большасць пытанняў вырашаецца, безумоўна ж, са старшынёй сельскага Савета.

Тыя ж дачныя кааператывы дабаўляюць турбот з несанкцыянаванымі звалкамі. Толькі сёлета давялося адцягнуць сродкі сельвыканкама на ўборку трох сметнікаў. З вывазам бытавых адходаў з падворкаў прасцей: заключыў дагавор з жылкамгасам, і машына прыязджае па графіку.

— Не спыняюцца званкі і з пытаннямі пра старыя дрэвы на могілках. Але паколькі мясцовасць гарыстая, то да векавых соснаў падабрацца цяжка. Мікалай Мікалаевіч нават спецыялістаў з Віцебска выклікаў, так званых альпіністаў. Дык тыя склалі каштарыс аж на 12 мільёнаў! І гэта датычылася толькі адных могілак. А іх у Чамерах пяць. Вось і даводзіцца прыцягваць жылкамгас, у тых выпадках, калі гэта магчыма, — расказвае Марыя Чыгрын.

У селькам, акрамя Марыі Сцяпанаўны, уваходзяць дырэктар грузавога аўтапарка № 11 Алег Міско і намеснік дырэктара па будаўніцтве «Белтрансгаза» Валерый Шчэрбітаў. Іх арганізацыі, калі закранаецца агульная справа, не адмаўляюцца выдзяліць касілку для газона або кран. І пясок падвязуць на могілкі, калі ўзнікне пытанне па добраўпарадкаванні.

— А ўвогуле, — гаворыць Марыя Сцяпанаўна, — у якую б раённую арганізацыю ні звярнулася, не адмовяць, калі ў іх сілах штосьці зрабіць.

Галіна РАМАНЧУК.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	1	2	3	4
Предмет аукциона (месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер)	Земельный участок № 1, расположенный по адресу: Гродненская область, г. Щучин, микрорайон по ул. Ленина (юго-западная окраина г. Щучина по ул. Рудого, 9), кадастровый номер 425850100002000645	Земельный участок № 3, расположенный по адресу: Гродненская область, г. Щучин, микрорайон по ул. Ленина (юго-западная окраина г. Щучина по ул. Рудого, 11), кадастровый номер 425850100002000644	Земельный участок, расположенный по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Советская (возле гостиницы «Элен»), кадастровый номер 425850100001000254	Земельный участок, расположенный по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Советская (в районе автопарка № 12), кадастровый номер 425850100001000253
Площадь, га	0,1147	0,1359	0,3882	0,2706
Срок аренды	30 лет	30 лет	30 лет	30 лет
Цель	Строительство здания кафе на 138 посадочных мест	Строительство здания магазина промышленных и продовольственных товаров	Строительство здания магазина продовольственных и непродовольственных товаров	Строительство станции технического обслуживания автомобилей
Дополнительные затраты, связанные с предоставлением участка	Компенсация потерь сельскохозяйственного производства, вызванных с изъятием сельскохозяйственных земель для использования их в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, в сумме 5 535,29 тыс. руб.	Компенсация потерь сельскохозяйственного производства, вызванных с изъятием сельскохозяйственных земель для использования их в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, в сумме 7 167,44 тыс. руб.	–	Перенос контейнерной площадки для сбора твердых бытовых отходов
Характеристика земельного участка (инженерная инфраструктура, наличие ограничений в использовании)	Существует возможность подключения к центральной теплотрассе, газопроводу, электроснабжению, водопроводной и канализационной сети	Существует возможность подключения к центральной теплотрассе, газопроводу, электроснабжению, водопроводной и канализационной сети	Существует возможность подключения к центральной теплотрассе, газопроводу, электроснабжению, водопроводной и канализационной сети, ограничения в использовании по перечню № 5 – охранная зона кабеля связи на площади 0,0233 га, № 6 – охранная зона кабельной линии электропередач на площади 0,0102 га и по перечню № 7 – охранная зона канализационного коллектора на площади 0,0133 га	Существует возможность подключения к центральной теплотрассе, газопроводу, электроснабжению, водопроводной и канализационной сети
Начальная цена предмета аукциона, руб.	6 689 803	7 926 289	29 361 729	13 314 456
Сумма задатка, руб.	668 000	792 000	2 936 000	1 331 000

1. Аукцион состоится **11 марта 2011 г. в 11.00** по адресу: 231513, г. Щучин, пл. Свободы, 11 (здание Дома Советов, 2-ой этаж, малый зал районного Совета Депутатов).

Заключительная регистрация участников аукциона **11 марта 2011 г. с 8.30 до 10.30.**

2. Организатор аукциона – Щучинский районный исполнительный комитет (далее – райисполком), г. Щучин, пл. Свободы, 11; контактные телефоны комиссии: председатель (8 01514) 27044, заместитель председателя (8 01514) 27064, секретарь (8 01514) 28152.

3. Прием заявлений и прилагаемых документов на участие в аукционе производится **с 11 февраля 2011 г. по 4 марта 2011 г. включительно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00,** кабинет 54 землеустроительной службы райисполкома.

4. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также заверенную копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

5. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет организатора аукциона № 3604527000016 ЦБУ филиала № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Щучин, код 752, получатель Щучинский районный исполнительный комитет, УНП 500066573.

6. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

7. Победитель аукциона обязан:

подписать протокол аукциона;

в течение 10 рабочих дней после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды; возместить затраты за проектно-изыскательские землеустроительные работы, за государственную регистрацию; компенсация потерь сельскохозяйственного производства; возместить расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ.

8. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

ЛОТ 1	
Наименование объекта	Изолированное помещение № 2 в здании магазина (торговое помещение)
Краткая характеристика	Изолированное помещение № 2 (1 этаж – инв. № 412/D-9886) в здании магазина с цокольным этажом, общая площадь изолированного нежилого помещения 92,9 кв.м, объем изолированного нежилого помещения 370 м.куб., стены и перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, крыша – волнистые асбестоцементные листы по деревянным стропилам, полы бетонные, линолеум, отопление центральное, чугунные радиаторы, электроснабжение – скрытая электропроводка, телефон – каблировка.
Начальная цена продажи	100 000 000 белорусских рублей с учетом НДС.
Сумма задатка	10 000 000 белорусских рублей.
Местонахождение объекта	г. Мосты, ул. Песочная, 13
Земельный участок	Кадастровый № 424050100014000175, общая площадь земельного участка – 0,0286 га, закрепленный за изолированным помещением инв. № 412/D-9886 – 0,0136 га, назначение – для обслуживания здания торговли
Продавец	Мостовское районное потребительское общество г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41 98 32, 41 98 34
Условия аукциона	Аукцион без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012286350011, отделение № 201 г. Гродно ГФ по Гродненской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 152101705, УНП 500833225

Аукцион состоится 16 марта 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3

К участию в аукционе допускаются юридические лица, физические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – нотариально заверенная доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3 с 8.30 до 17.30
Последний день приема заявлений – 15 марта 2011 г. до 15.00.

Телефон для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.

Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30.